Крайне важной является эмоциональная составляющая. Лекторы, такие как Федор Петров, используют живую речь, жесты, шутки и простые аналогии, чтобы «объяснить на пальцах» сложные археологические концепции. При этом центральной темой остается региональная история – локальные памятники, этногенез, повседневная жизнь древних народов Урала. Именно эта привязка к месту и идентичности, по-видимому, обеспечивает устойчивый интерес, несмотря на сравнительно небольшое число подписчиков.

Таким образом, канал «Креативные индустрии Урала» демонстрирует, что эффективная популяризация археологии возможна даже в региональном масштабе. Успех проекта основан на грамотном сочетании научной достоверности и современных медиатехнологий. Ключевыми факторами являются четкая повествовательная структура, визуальное обогащение материала, личностный фактор лектора и фокус на локальной тематике. Данный кейс может служить образцом для создания других научно-популярных медиапроектов, направленных на приближение науки к широкой аудитории.

Библиографические ссылки

1. *Зайкова Е. С.* Технологии сторителлинга в современной практике журналиста // Медиасреда. 2021. № 1. С. 10–16.
2. *Панюкова С. А.* Функциональность метода цифрового сторителлинга в научно-популярных материалах // Известия Уральского федерального университета. Сер. 1. 2020. Т. 26. № 3(199). С. 105–111.
3. *Симакова С. И., Енбаева А. П.*, *Исакова Т. Б.* Мультимедийный сторителлинг – теоретическое осмысление // Вестник Волжского университета им. В. Н. Татищева. 2019. Т. 1. № 1. С. 222–230.
4. *Топчий И. В.*, *Иванова Д. О.* Специфика аудиовизуального сторителлинга в медиапроектах научно-популярной тематики // Челябинский гуманитарий. 2024. № 3(68). С. 81–89.

СПЕЦЫФІКА ДЗЕЙНАСЦІ ДЫКТАРАЎ БЕЛАРУСКАГА РАДЫЁ Ў 1925–2025 ГГ.

У. А. Трапянок

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў,
вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
trepenok.bguki@gmail.com

Разглядаюцца асаблівасці працы дыктараў на дзяржаўным радыё – ад пошукаў галасоў і стылістыкі гучання ў першыя гады вяшчання да трансфармацыі прафесіі ў XXI ст. Сабраны факталагічны матэрыял дэманструе запатрабаванасць майстроў эталоннага гучання ў радыёвытворчасці на працягу стагоддзя.

Ключавыя словы: Беларускае радыё; дыктар; спецыфіка дыктарскага майстэрства; вяшчанне.

СПЕЦИФИКА ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ДИКТОРОВ БЕЛОРУССКОГО РАДИО В 1925–2025 ГГ.

В. А. Трепенок

Белорусский государственный университет культуры и искусств,
ул. Рабкоровская, 17, 220007, г. Минск, Республика Беларусь,
trepenok.bguki@gmail.com

Рассматриваются особенности работы дикторов на государственном радио – от поисков голосов и стилистики звучания в первые годы вещания до трансформации профессии в XXI в. Собранный фактологический материал демонстрирует востребованность мастеров эталонного звучания в радиопроизводстве на протяжении столетия.

Ключевые слова: белорусское радио; диктор; специфика дикторского мастерства; вещание.

Рэгулярнае дзяржаўнае радыёвяшчанне пачалося 15 лістапада 1925 г. з адкрыцця ў Мінску радыёстанцыі РВ-10 імя Саўнаркама БССР. Падзея стала важнай вяхой у жыцці Беларусі, паколькі насельніцтва атрымала

магчымасць чуць інфармацыю на роднай мове са сталіцы рэспублікі. Паступовае ўдасканальванне эфірнай палітыкі радыёстанцыі прывяло да станаўлення і развіцця беларускай дыктарскай школы, тэма якой за стагоддзе існавання аўдыяльнага вяшчання пакуль не знайшла шырокага адлюстравання ў навуковых працах даследчыкаў, што сведчыць пра актуальнасць і своечасовасць гэтага матэрыялу.

Спецыфіка дыктарскага радыёмайстэрства заключаецца ў адсутнасці гледача, пры гэтым, уздзеянне адбываецца адначасова на вялікую аўдыторыю. Абавязковыя ўмовы для працы дыктара – бездакорная дыкцыя, радыёфанічны (прыемны на слых) голас, эрудзіраванасць, інфарміраванасць, ідэйная перакананасць, узорнае валоданне мовай, высокая культура маўлення. Асноўнай функцыяй дыктара на працягу існавання прафесіі з'яўляецца агучванне розных тэкстаў. Весці перадачу трэба так, каб максімальна наблізіць чытанне да «жывой» гаворкі, мець адказы на пытанні «пра што я кажу?» (разуменне сэнсу, утрымліванне «стрыжня», што праходзіць праз увесь тэкст), «каму?» (нябачная аўдыторыя, пераўтвораная праз уяўленне ў канкрэтныя вобразы слухача, адчуванне суразмоўцы) і «навошта?» (ацэнка значнасці матэрыялу, адносіны прамоўцы да зместу), што з'яўляюцца складнікамі пастаяннай увагі дыктара. Гэта значыць, любы тэкст, які даводзіцца агучваць, прамоўца павінен прапускаць праз уласнае разуменне, паглыбляцца ў сутнасць матэрыялу, якая пасадзейнічае з'яўленню неабходнай інтанацыі. На нашу думку, пералічаныя патрабаванні вызначаюць дзейнасць беларускіх дыктараў з сярэдзіны XX ст. да сучаснасці, аднак у мінулым стагоддзі, калі яшчэ не існавала персаніфікацыі вядучых, дыктар выконваў пераважна «тэхнічную функцыю» – агучванне тэксту прыемным на слых голасам. «Ажыўленыя фразы», характэрныя найперш для мастацкага вяшчання, былі перавагай штатных ці запрошаных для радыёвытворчасці артыстаў (некаторыя з іх сталі выдатнымі дыктарамі).

З першых дзён працы мінскай радыёстанцыі праблема дыктараў стаяла надзвычай востра, паколькі гэтай прафесіі нідзе не вучылі. Слабымі былі тэхнічныя магчымасці вяшчання – напрыклад, у якасці мікрафона выкарыстоўвалася тэлефонная трубка з вугальным парашком, што спякаўся, адпаведна, падчас прамога эфіру даводзілася прадзьмуваць прыладу [1, с. 16]. Пры ўжыванні такой недасканалай апаратуры голас дыктара, які зачытваў інфармацыйныя паведамленні, павінен быць моцным, каб перакрыць усе шумы. Па ўспамінах вопытнага супрацоўніка радыёвяшчання, мовазнаўцы У. Юрэвіча,

першым беларускім дыктарам стаў радыёмеханік М. Дземяхоўскі, які меў густы, магутны бас, але слабы ўзровень культуры мовы [2]. Таму да пачатковага радыёвяшчання прыцягвалі студэнтаў БДУ і педагогаў, што добра валодалі родным словам.

Дыктарскі састаў Беларускага радыё ў 1926 г. сфарміравалі два паэты-пачаткоўцы, уладальнік барытону Я. Бобрык і драматычны тэнар Я. Туміловіч; а таксама настаўніца з пастаўленым ад прыроды мецца-сапрана Н. Кабаліна. Паколькі асноўным тагачасным кірункам вяшчання з'яўлялася інфармаванне, тон працы дыктараў быў афіцыйным, строгім, без ацэнак і эмоцый, чытанне тэксту літарка ў літарку, як адзначаў У. Юрэвіч, рабіла інтанацыі прымітыўнымі [2]. Несумненна, такое агучванне не магло доўга ўтрымліваць слухацкую ўвагу.

Пытанне стабільнасці і прафесійнага ўзроўню дыктарскіх кадраў стаяла нароўні з іншымі праблемамі па ўдасканальванні і развіцці беларускага радыёвяшчання. Хібы падрыхтоўкі тагачасных вядучых выпраўлялі ўласнымі сіламі – заўзяты радыёаматар і дыктар А. Юрэвіч у другой палове 1920-х гг. стварыў студыю, у якую прыйшлі Г. Альфер, Л. Батвіннік, А. Война, Т. Зіміёнка, Л. Кардашэнка, В. Матус, Э. Табольская. Акцэнт у выхаванні «студыйцаў» быў накіраваны на эстэтычныя магчымасці «жывога» маўлення, трапнага выкарыстання ўсіх пластоў гаваркога слова, уменне імправізаваць, а таксама не толькі чытаць, але і праводзіць перадачы для слухачоў розных слаёў і ўзростаў. Паколькі наведвальнікі студыі былі маладымі, многія з іх, у тым ліку А. Юрэвіч, па прычыне жыццёвых абставін не змаглі застацца на радыё. Асабліва востра стаяла пытанне наяўнасці мужчынскіх галасоў. На мяжы 1920–1930-х гг. у якасці дыктара працаваў загадчык сектара выпуску М. Харламаў, які валодаў прыгожым тэмбрам голасу і меў рухавае маўленне [2], што, як можам меркаваць, дадавала інтанацыйнай выразнасці агучаным тэкстам.

Асноўны дыктарскі мужчынскі састаў у 1930-х гг. складалі У. Юрэвіч, Л. Абадоўскі, М. Ігнатковіч, жаночы – Н. Зальцман, Л. Беленькая, а таксама выпускніцы дыктарскай студыі Л. Батвіннік і В. Матус [2]. Радыё перайшло на «трыбуннае гучанне» з наяўнасцю высокай публіцыстычнай думкі і патэтыкі, адпаведных інтанацый і галасавога пасылу. Невялікая дыктарская група была задзейнічана ў вядзенні перадач пераважна ў прамым эфіры, які доўжыўся чатырнаццаць, пазней – дваццаць гадзін за суткі. У рэзерве аратарскай каманды меліся

прадстаўнікі студэнцкай моладзі (Альпяровіч, Барсукоў, Шклоўскі, Штэйн) [2].

У гады Вялікай Айчыннай вайны вяшчанне радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» ажыццяўлялася з Масквы. Работу дыктараў працягвалі У. Юрэвіч і Л. Батвіннік. Складаныя ўмовы ўплывалі на спецыфіку дыктарскага чытання, якое, як і ў перадваенныя гады, вызначалася патэтыкай з яшчэ большай публіцыстычнай узнёсласцю.

Патэтычна-публіцыстычны кірунак беларускай дыктарскай школы знайшоў развіццё і ў пасляваенныя часы. Выбар супрацоўнікаў дзяржаўнага радыё, якім даручалася вядзенне перадач розных жанраў, палягаў на веданні беларускай мовы, чысціні дыкцыі, выкарыстанні добра пастаўленага ад прыроды дыхання і адметнасцей голасу – выносліваści, нестамляльнасці, сілы, прысутнасці «металу», шырокага дыяпазону, выразнай тэмбральнай афарбоўкі і радыёфанічнасці. Гэтыя крытэрыі адбору за выключэннем прысутнасці «металу» сталі вызначальнымі для пошуку наступных пакаленняў дыктараў рэспубліканскага радыё. Тэндэнцыі для перайманння задаваліся таксама калегамі з маскоўскага вяшчання. Дыктар Усесаюзнага радыё Н. Талстова адзначала, што для аўдыяльнага СМІ найбольш падыходзяць чыстыя, не вельмі гучныя, гнуткія, грудныя ці цёплыя галасы шырокага дыяпазону. Яны «льюцца» лёгка і свабодна, не перагружаюць мікрафон, прыемныя на слых. Такі голас павінен быць абавязкова «сваім», гэта значыць яго ўладальніку не варта захапляцца перайманнем [3, с. 26–27].

Плённым вынікам далейшых пошукаў па развіцці нацыянальнай дыктарскай школы стала далучэнне да радыёвяшчання выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага тэатральнага інстытута, у прыватнасці, І. Кургана і Л. Стасевіч. Гэта прафесіяналы, якія ў працы перад мікрафонам абапіраліся на асновы тэатральнага мастацтва з найвышэйшай аддачай, захопленасцю матэрыялам, што даводзілася агучваць. Аб прыходзе на радыё ў 1949 г. Ілья Львовіч успамінаў, што «працавалі там і іншыя “рыцары” мікрафона – адораныя, тэмпераментныя, адукаваныя, у якіх можна было павучыцца не толькі валоданню чыстай, лёгкай і арганічнай беларускай мове, але і асновам прафесійнага майстэрства» [4, с. 49]. І. Курган і Л. Стасевіч вялі шматлікія тагачасныя перадачы, бралі ўдзел у выкананні радыёкампазіцый, спектакляў. Дарэчы, праца з мастацкім тэкстам вызначаецца ўласнай спецыфікай. Як адзначаў савецкі мэтр У. Аксёнаў, асноўнае зерне такога майстэрства, «увесь сэнс яго заключаны не ў дыкцыі, не ў голасе і нават не ў разумным разборы фразы ці

кавалка твора, а ва ўменні правільна трактаваць гэты твор, гэта значыць, пазнаючы ідэю аўтара, прапітваць яе сваімі, кроўнымі, актыўнымі, дзейснымі адносінамі – ва ўменні, у выніку правільнага разбору матэрыялу і дакладных яго ацэнак, выклікаць патрэбную інтанацыю, выяўляючы праз яе сваё творчае памкненне» [5, с. 45–46]. Такім чынам, да сярэдзіны XX ст. айчынная школа радыёдыктара набыла высокі прафесійны ўзровень, яе прадстаўнікі валодалі тонкім адчуваннем слова як вызначальнага сродку зносін з нябачнай аўдыторыяй.

З пачаткам тэлевізійнага вяшчання ў 1956 г., якое стала моцным канкурэнтам радыё, пачалося ўкараненне даверлівага тону, «цёплага», душэўнага спосабу ўздзеяння на слухачоў без «металу» ў голасе, адыход ад залішняга пафасу. Пры гэтым, многія дыктары засвойвалі спецыфіку аўдыявізуальнай крыніцы падачы інфармацыі, сумяшчалі працу на радыё і ТБ. Напрыклад, першы дыктар Беларускага тэлебачання Т. Бастун пачынала як дыктар радыё. У двух СМІ выдатна праявіў сябе У. Шэліхін. Айчынная дыктарская школа лічылася адной з лепшых у Савецкім Саюзе [6]. У гісторыю Беларускага радыё ўпісаны імёны дыктараў М. Чырыка, К. Чарткова, Г. Барташэвіча, М. Анціпава, Л. Валодзіна, які браў удзел у запісах шматлікіх мастацкіх запісаў, І. Цвярскога. Каманду дыктараў інфармацыйных, публіцыстычных, мастацкіх радыёперадач дапаўнялі Э. Данчанка, Г. Сідзельнікава, Н. Аўчыннікава, Г. Яроменка, С. Рудкоўская, У. Баклейчаў. Майстэрства выкшталцонага слова падтрымлівалі таксама А. Свістуновіч, С. Гілеўская, Л. Пількевіч, Л. Дзяркач. Атрымаўшы вопыт на Беларускім радыё, дыктары В. Шабека, М. Вінакур і Т. Куркевіч працягвалі працу на Цэнтральным тэлебачанні і Усесаюзным радыё. Пра запатрабавасць аратарскай прафесіі і павышаную ўвагу да яе сведчаць факты надання дыктарам высокіх званняў. Так, заслужанымі артыстамі БССР сталі Л. Стасевіч (1965), І. Курган (1968), Г. Сідзельнікава (1975), М. Чырык (1991) [6]. У 1980-я гг. каманду дыктараў дапоўнілі І. Майсеева, А. Вінярскі, М. Захарыя, К. Ягорава і інш. У параўнанні з вяшчаннем у першай палове XX ст. колькасны паказчык дыктараў, задзейнічаных у стварэнні разнастайных радыёперадач, значна павялічыўся.

Аднак, па словах У. Юрэвіча, у 1960-я гг. развіццё беларускай школы дыктараў пачало аслабляцца, у пачатку 1980-х гг. спынілася. У майстроў старэйшага пакалення назіралася страта імпэту да гадамі выпрацаванага прафесіяналізму. Уладзімір Міхайлавіч адзначаў, што «абыякавае вычытванне ці, нават, выспеўванне тэксту без увагі да граматычных паўз,

не кажучы ўжо пра лагічныя, стварае ўражанне, быццам дыктары турбуюцца пра адно – найбольш выдаць у эфір “слоўнай руды”, не беручы на сябе цяжкасць апрацаваць яе, аддзяліць галоўнае ад другараднага, каб сцвердзіць яркі публіцыстычны змест, закладзены ў падрыхтаваным рэдакцыяй мікрафонным матэрыяле. Ці не занадта шмат у беларускім эфіры “буслінага клёкату”, расперазанай бытавой стыхіі, мармытання сабе пад нос, сакатання, лапатання, балбатання, усяго таго, што сведчыць пра пэўны правінцыялізм у рабоце большасці дыктараў…?» [2, с. 34]. Падобныя выказванні даюць падставы гаварыць аб змяненні ў 1980-х гг. хуткасці дыктарскага маўлення, аб адыходзе ад эталоннага, удумлівага чытання да спрошчанай падачы матэрыялаў. Такая тэндэнцыя найбольш праявілася ў наступныя дзесяцігоддзі.

Пасля зацвярджэння ў верасні 1994 г. Палажэння аб Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь пачаўся новы этап дзейнасці дзяржаўных аўдыявізуальных СМІ, які прывёў да фарміравання сучасных прыярытэтаў вяшчальнай палітыкі. Адным з новаўвядзенняў стала паступовая ліквідацыя інстытута дыктараў, замена мэтраў з адпрацаванымі навыкамі аратарскага майстэрства на вядучых з «жывымі» галасамі, «свежымі» інтанацыямі, характэрнымі для простай мовы. На Беларускім радыё да чарговай рэструктурызацыі ў пачатку 2000-х гг. яшчэ можна было пачуць дзелавітае, выразнае слова дыктараў М. Чырыка, Л. Пількевіч, В. Дзягілева, В. Будзевіча, Т. Лонскай, У. Баклейчава, К. Ягоравай, С. Шушаковай, М. Захарыі і інш. Паралельна вядзенне радыёперадач стала прэрагатывай журналістаў, рэдактараў.

У XXI ст. прафесія дыктара, які агучваў чужы, загадзя падрыхтаваны тэкст як свой, стала яшчэ менш запатрабаванай. Спецыялісты, якія засталіся на радыё, засвойвалі рэдактарскія навыкі, удзельнічалі пераважна ў падрыхтоўцы мастацкіх праектаў, паколькі зменшылася колькасць запрошаных на радыё акцёраў. У 2000-х – 2010-х гг. традыцыі дыктарскай школы падтрымлівалі К. Ягорава, У. Баклейчаў, С. Шушакова, М. Захарыя і А. Вінярскі. У цяперашні час М. Захарыя працуе рэдактарам на міжнародным радыё «Беларусь», выканаўца літаратурных праектаў для дзяцей і дарослых на канале «Культура». А. Вінярскі выступае чытальнікам мастацкіх перадач канала «Культура», ставіць нешматлікія паўнавартасныя радыёспектаклі. У вядзенні перадачы «Рэтра» на Першым нацыянальным канале задзейнічаны У. Баклейчаў.

Такім чынам, станаўленне прафесіі радыёдыктара пачалося з запуску вяшчання мінскай радыёстанцыі ў лістападзе 1925 г. Да сярэдзіны XX ст. стылістыка гучання прадугледжвала наяўнасць прымітыўных інтанацый, афіцыйнага тону, «металу» ў галасах нешматлікай каманды дыктараў, патэтыкі, трыбуннасці. З канца 1940-х гг. дыктарскі састаў дапоўнілі прафесіяналы з акцёрскай адукацыяй, што прывяло да ўжывання інтанацый з большай шчырасцю і выразнасцю, але з абавязковай наяўнасцю дзелавітасці гучання, бездакорнасцю вымаўлення. У другой палове XX ст. паступова павялічваўся колькасны паказчык дыктараў, якія ўдзельнічалі ў перадачах розных жанраў – ад інфармацыйных да мастацкіх. Трансфармацыі ў прафесіі, што адбыліся ў 1980-я – 1990-я гг., прывялі да замены эталоннага гучання простай мовай, дыктара – вядучым (журналістам, рэдактарам). У XXI ст. прафесія страціла былую запатрабаванасць, нешматлікія дыктары сучаснага Беларускага радыё (У. Баклейчаў, А. Вінярскі, М. Захарыя) заняты пераважна ў падрыхтоўцы літаратурна-драматычнага вяшчання.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Радкевіч Я. Р.* Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця. Мінск : Выд-ва БДУ, 1983. 197 с.
2. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва (БДАМЛІМ). Ф. 474. Воп. 1. Спр. 30. Лл. 33 об. 34 об.
3. *Корзинкина И. В.* Работа диктора и актера у микрофона : учеб. пособие по курсу «Сцен. речь» для театр. ин-тов. М. : [Б. и.], 1977. 87 с.
4. Дельфина. Золотой голос Беларуси. Илья Курган / Дельфина (Е. В. Минчукова). Минск : Белпринт, 2011. 256 с.
5. *Толстова Н. А.* Из записок диктора: [О. Н. Абдулов, Д. Н. Орлов, В. Н. Аксенов, В. Н. Яхонтов, В. И. Качалов, С. М. Михоэлс, М. М. Лебедев, В. А. Гладкий, Е. А. Юзвицкая на радио]. М. : [Б. и.], 1965. 106 с.
6. *Васюкевич А. Б.*, *Малмыго Т. В.* Информационное пространство: радиовещание. URL: https://belarusenc.by/belarus/detail-article.php?ID=4388#h1 (дата обращения: 19.05.2025).

Раздзел IV

МЕДЫЯЛІНГВІСТЫКА І РЭДАГАВАННЕ

ОБУЧЕНИЕ КИТАЙСКИХ СТУДЕНТОВ СВОБОДНОМУ ДИАЛОГИЧЕСКОМУ ОБЩЕНИЮ НА РУССКОМ ЯЗЫКЕ С ИСПОЛЬЗОВАНИЕМ ИННОВАЦИОННЫХ ТЕХНОЛОГИЙ

Е. И. Абрамова

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
Abramova@bsu.by

В статье рассматриваются вопросы методики обучения китайских студентов свободному диалогическому общению на русском языке. Внимание обращается как на собственно лингвистические, так и экстралингвистические факторы, вызывающие трудности в обучении, а также на необходимость использования в практике преподавания РКИ инновационных технологий.

Ключевые слова: методика обучения русскому языку как иностранному; личностно-деятельный подход; обучение в сотрудничестве; лингвистические и эсктралингвистические факторы в обучении РКИ; китайские студенты; свободное диалогическое общение; инновационные методические приемы.

НАВУЧАННЕ КІТАЙСКІХ СТУДЭНТАЎ СВАБОДНЫМ ДЫЯЛАГІЧНЫМ ЗНОСІНАМ НА РУСКАЙ МОВЕ З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІНАВАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Я. І. Абрамава

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Abramova@bsu.by

У артыкуле разглядаюцца пытанні методыкі навучання кітайскіх студэнтаў свабодным дыялагічным зносінам на рускай мове. Увага звяртаецца як на ўласна лінгвістычныя, так і экстралінгвістычныя фактары, якія выклікаюць цяжкасці ў навучанні, а таксама на неабходнасць выкарыстання ў практыцы выкладання РЯЗ інавацыйных тэхналогій.

Ключавыя словы: методыка навучання рускай мове як замежнай; асобасна-дзейны падыход; навучанне ў супрацоўніцтве; лінгвістычныя і экстралінгвістычныя фактары ў навучанні РЯЗ; кітайскія студэнты; свабодныя дыялагічныя зносіны; інавацыйныя метадычныя прыёмы.

Свободное общение является одной из конечных и часто труднодостижимой целью обучения русскому языку китайских студентов. В практике преподавания РКИ при обучении речевой деятельности, в формировании коммуникативных компетенций у иностранных обучающихся активно используется личностно-деятельностный подход. Он основан на равнопартнерском сотрудничестве преподавателя и студента и признается эффективной формой обучения речевой деятельности [4, с. 206], и это справедливо для лингвистических специальностей. На неспецфакультетах, где русскому как иностранному отводится от 4 до 8 часов в неделю, добиться того, чтобы студенты из КНР вышли на действительно свободный уровень общения с носителями русского языка, значительно труднее. При этом китайские студенты быстро воспринимают письменный текст, легко справляются с заданиями, направленными на выполнение упражнений, перевод, ответы на вопросы к текстам и т. п., то есть обладают достаточными знаниями грамматики и лексики, но эти знания не конвертируются в речь. Трудности обучения китайских студентов свободному устному общению на русском языке связаны с рядом вполне объективных лингвистических и экстралингвистических факторов, которые не всегда осознаются (или не принимаются во внимание) преподавателями.

К лингвистическим факторам относится разница в русской и китайской языковых системах, которая касается всех уровней языка, включая графику [1, с. 155]. Китайский язык – это язык изолирующего типа, в нем отсутствует словоизменение, он имеет фиксированный порядок слов в предложении и высокую контекстность в связи с большим количеством омонимов. Поэтому при построении русских предложений китайцам трудно смириться с большим количеством словоформ, с тем, что

порядок слов в предложении не является фиксированным, более того, смысл высказывания может зависеть от порядка слов в предложении [2, с. 76]. При изучении русского языка китайским студентам приходится осваивать принципиально иной способ формирования и формулирования мысли.

Вызывают трудности в обучении свободному общению и внеязыковые факторы.

Во-первых, эти трудности связаны с особенностями традиционной методики преподавания и в целом образовательной системы Китая. В КНР главной задачей учащегося является запоминание и воспроизведение большого количества материала, при этом не предусматривается ни анализ этого материала, ни выражения своего отношения к нему.

Во-вторых, это особенности национальной психологии и культурные установки: китайцы замкнутые, сдержанные, они стесняются инициировать беседу с незнакомыми или малознакомыми людьми. Китайские студенты с трудом преодолевают психологический барьер в процессе коммуникации до появления полной уверенности в усвоенной лексике и грамматической системе. Даже находясь в языковой среде, китайские студенты не стремятся общаться со студентами – носителями русского языка, с которыми обучаются на одном факультете, так как опасаются попасть в неловкое положение из-за недостаточного знания русского языка. У китайцев есть понятие чести, дословно переводимое на русский язык как «лицо»: эта категория предполагает боязнь ошибиться и потерять свое «лицо» в обществе [3, с. 14–21]. Потеря лица для китайцев недопустима, это и объясняет нежелание китайцев выражать свои мысли на публике. Поэтому, исправляя ошибки студентов, анализируя неправильные ответы на занятиях, преподаватель должен проявлять такт и сдержанность.

В-третьих, это стереотипы поведения: интровертный характер китайцев базируется на понятии «нэй шэн» – «внутренняя мудрость». Как следствие, китайцы не любят говорить о себе, не стремятся в беседе навязывать или защищать свою точку зрения, ведут себя скромно. Поэтому организовать учебную дискуссию с китайскими студентами – это для преподавателя задача нетривиальная.

В-четвертых, трудности, связанные с адаптацией к жизни и учебе в Беларуси, являются причиной закрытости групп китайских студентов для инокультурного общения; они создают как бы мини-модель китай-

ского общества, социальное пространство, в котором они чувствуют себя более или менее комфортно. В повседневной жизни они общаются в основном со своими земляками на родном языке, по-русски говорят лишь в случае необходимости.

Преподавателям РКИ необходимо учитывать все эти факторы при обучении китайских студентов свободному диалогическому общению. Эти же факторы необходимо учитывать и преподавателям спецпредметов.

Кроме того, следует отметить, что подходы и инструментарий в обучении иностранцев коммуникативным навыкам требуют адаптации к быстро меняющемуся миру и новым технологиям.

До сих пор в формировании коммуникативных навыков студентов-инофонов преподаватели опираются в основном на учебник, определяя объем и характер языкового материала, предлагаемого учащимся. И этот специальный «язык учебника» порой существенным образом отличается от живого языка. К тому же в большинстве учебных пособий по русскому языку как иностранному развитию умений и навыков действительно свободного устного диалогического общения уделяется, по нашему мнению, недостаточно внимания. Ликвидировать этот недостаток помогает использование мультимедийных средств. При этом необходимо отметить, что мультимедийные средства, применяемые в обучении коммуникации на русском языке, обладают значительно большим дидактическим потенциалом, чем тот, который используется в настоящее время. Среди негативных факторов, снижающих эффективность их применения, можно отметить несистемный характер использования, неоправданную избыточность пассивных форм работы, отсутствие деятельностного характера заданий, недостаточный учет индивидуальных особенностей учащихся и др.

В процессе учебы китайские студенты медлительны, склонны к длительному осмыслению материала, и поэтому преподаватель вынужден использовать низкий темп обучения: выделять время на обдумывание нового материала в процессе аудиторных занятий. При этом каждый студент имеет свой уровень языковых знаний, темп изучения и особенности восприятия информации. Повысить эффективность преподавания позволяет использование широкого инструментария информационных образовательных технологий.

Инновационным методическим приемом (еще недостаточно оцененным преподавателями РКИ) является использование онлайн-платформ и приложений с элементами искусственного интеллекта. Образовательные платформы предлагают видеоуроки, онлайн-курсы, вебинары, аудио- и видеозаписи, трансляции лекций в режиме реального времени, тестовые задания и др. Они позволяют студентам изучать язык как в аудитории, так и во внеаудиторное время (под руководством преподавателя). Возможность посмотреть и послушать видео-занятие, видеолекцию и т. д. неоднократно является большим плюсом для студентов, так как это обеспечивает более глубокое усвоение материала. Растущая популярность онлайн-платформ также привела к появлению обучающих игр и виртуальных классов. Такие игры помогают студентам активно применять языковые навыки в игровой форме. Виртуальные классы, реализованные на основе виртуальной реальности, позволяют студентам погрузиться в иммерсивную среду и научиться реагировать на различные коммуникативные ситуации на русском языке. Это помогает снять языковой барьер и развить уверенность в использовании языка.

Современные приложения предлагают широкий спектр методик и заданий для самостоятельного изучения языка. Они позволяют студентам тренировать навыки чтения, письма, говорения и понимания на слух, а также предоставляют доступ к большому количеству учебных материалов и словарей. Система искусственного интеллекта анализирует ошибки студентов и предлагает индивидуальные рекомендации для улучшения языковых навыков. ИИ может быть использован преподавателем для персонализации обучения.

Правда, отношение к ИИ у преподавателей РКИ неоднозначное. Опыт показывает, что ИИ открывает широкие возможности для обмана: использование ChatGPT позволяет студентам переложить львиную долю работы без самостоятельного изучения необходимого материла на искусственный интеллект. Но поскольку ИИ уже стал частью нашей жизни, необходимо признать этот факт и использовать искусственный интеллект в учебном процессе.

Цифровые средства задействуют различные каналы восприятия обучающихся, обеспечивают вовлеченность студентов в учебный процесс, повышают уровень их мотивации и способствуют подбору индивидуального ритма и темпа работы исходя из особенностей учащихся.

Все эти технологические тренды в обучении китайских студентов общению на русском языке помогают сделать процесс изучения более интересным, доступным и эффективным, индивидуализированным. Однако необходимо отметить, что технологические инструменты не заменяют профессионального преподавателя, а являются лишь дополнительными средствами для углубления знаний в области русского языка, формирования коммуникативных навыков у китайских студентов.

Библиографические ссылки

1. *Щукин А. Н.* Методика преподавания русского языка как иностранного: учеб. пособие для вузов / М.: Высш. шк., 2010. 349 с.
2. *Литовкина А. М.* Лингвистические предпосылки нарушения современных языковых норм иностранными студентами // Межкультурная коммуникация в пространстве Азиатско-Тихоокеанского региона: материалы Международной научно-практической конференции (г. Иркутск, 23–26 июня 2010 г.) / отв. ред. Г. И. Тунгусова. Иркутск: Изд-во Иркутского гос. ун-та, 2010. С. 154–161.
3. *Пруцких Т. А., Скобелкина Н. М.* Языковая интерференция в лингводидактическом аспекте // Педагогический имидж. 2018. № 3(40). С. 71–78
4. *Фахрутдинова М. Т.* Этнопсихологические особенности изучения русского языка как иностранного / В мире науки и искусства: вопросы филологии, искусствоведения и культурологии: Сб. ст. по материалам LVI Международной научно–практической конференции. Новосибирск: СибАК, 2016. № 1(56). С. 138–142.

БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў КАНТЭКСЦЕ ПРАЦЭСАЎ ГЛАБАЛІЗАЦЫІ: РЭДАКТАРСКІ АСПЕКТ

К. А. Арцюхоўская[1)], А. Р. Хромчанка[2)]

[1)]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
releryleric@gmail.com,

[2)]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
albina77153@gmail.com

Разглядаюцца праблема функцыянавання нацыянальных моў у эпоху глабалізацыі, пагроза іх знікнення і асабліва лёс беларускай мовы ва ўмовах білінгвізму. Адзначаюцца тэндэнцыя да захавання і пашырэння беларускай мовы і спробы вярнуць беларускую мову ў грамадскае жыццё праз дзейнасць асобных кампаній, якія ў сваёй анлайн-прасторы рэкламуюць прадукцыю на беларускай мове. Акцэнтуецца ўвага на асобных памылках, якія сустракаюцца ў перакладных тэкстах, што маглі з'явіцца ў выніку выкарыстання аўтаматычных перакладнікаў.

Ключавыя словы: сайт; анлайн-прастора; глабалізацыя; білінгвізм; пераклад; беларуская мова.

БЕЛОРУССКИЙ ЯЗЫК В КОНТЕКСТЕ ПРОЦЕССОВ ГЛОБАЛИЗАЦИИ: РЕДАКТОРСКИЙ АСПЕКТ

Е. А. Артюховская[1)], А. Р. Хромченко[2)]

[1)]Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
releryleric@gmail.com,

[2)]Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
albina77153@gmail.com

Рассматриваются проблема функционирования национальных языков в эпоху глобализации, угроза их исчезновения и особенно судьба белорусского языка в условиях билингвизма. Отмечаются тенденция к сохранению

и расширению белорусского языка и попытки вернуть белорусский язык в общественную жизнь через деятельность отдельных компаний, которые в своем онлайн-пространстве рекламируют продукцию на белорусском языке. Акцентируется внимание на отдельных ошибках, встречающихся в переводных текстах, что могли появиться в результате использования автоматических переводчиков.

Ключевые слова: сайт; онлайн-пространство; глобализация; билингвизм; перевод; белорусский язык.

Сучасныя працэсы глабалізацыі выклікалі занепакоенасць навукоўцаў лёсам нацыянальных моў. Яны мяркуюць, што «глабалізацыя хутчэй негатыўна ўплывае на нацыянальныя мовы, некаторыя з якіх знаходзяцца на мяжы вымірання» [1]. У той жа час выказваюцца думкі аб заканамерным развіцці цывілізацыі, што павінна ў канцавым выніку прывесці да адзінай мовы і аб'яднанага чалавецтва. У прыватнасці, А. Плотнікаў, спасылаючыся на кнігу У. Цапліна «Дзіўная цывілізацыя» (2005), адзначае, што меркаванне аўтара пра ўзаемаўплыў моў слушнае, бо наяўнасць шматлікіх моў з'яўляецца тормазам на шляху сацыяльнай глабалізацыі і перашкаджае абмену інфармацыяй. «Паслядоўная глабалізацыя немагчыма без якога-небудзь агульнага інструмента для абмену навінамі, інфармацыяй, эмоцыямі, г. зн. без агульназразумелай мовы… Хутчэй за ўсё, будзе ўзаемны уплыў і нараджэнне пэўнай агульнай мовы, на якой будзе размаўляць аб'яднанае чалавецтва» [2]. Аднак, як вядома, не маючы агульнай мовы, чалавечая цывілізацыя развівалася тысячы гадоў, назапашваючы ўнікальныя творы літаратуры, мастацтва, архітэктуры розных культур і народаў.

Лёс беларускай мовы, на нашу думку, у большай ступені залежыць не ад працэсаў глабалізацыі і тэхнічнага прагрэсу, але ад унутраных сацыяльна-палітычных умоў. Як адзначае М. Гуль у працы «Асаблівасці моўнай палітыкі ва ўмовах глабалізацыі (на прыкладзе рускай і беларускай моў)», беларуская мова хоць і з'яўляецца адной з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь і мовай тытульнай нацыі, але яна знаходзіцца пад пагрозай [3]. Пагроза вынікае з няроўнага білінгвізму, паноўнага функцыянавання рускай мовы практычна ва ўсіх сферах сацыяльнага, палітычнага, культурнага жыцця краіны. Аднак апошнім часам назіраюцца спробы вярнуць беларускую мову ў грамадскае жыццё, што засведчана дзейнасцю асобных кампаній, якія ў сваёй анлайн-прасто-

ры рэкламуюць прадукцыю на беларускай мове, напрыклад, кампаніі «Іў Рашэ», «Луч», «Белінвестбанк» і інш.

Як сцвярджае Э. Ш. Джалілава, пры перакладзе сайта на мову пэўнай краіны, трэба ўлічваць яе культурныя каштоўнасці: «Асноўным адрозненнем лакалізаванага перакладу з'яўляецца тое, што ў перакладзе ўлічваюцца культурныя каштоўнасці і традыцыі. Інакш кажучы, асноўная мэта лакалізацыі вэб-сайтаў – гэта культурная адаптацыя» [4]. Для перакладу тэкстаў некаторыя кампаніі наймаюць прафесійных перакладнікаў, у той час як іншыя ўжываюць аўтаматычныя перакладнікі, што вядзе да памылак розных моўных узроўняў.

«Іў Рашэ» – вядомая французская кампанія, якая спецыялізуецца на вытворчасці касметычных сродкаў на аснове раслінных інгрэдыентаў. Кампанія мае шырокую сетку крам па ўсім свеце і прадстаўляе сваю прадукцыю праз анлайн-магазіны, у тым ліку і ў Беларусі. Пераход на беларускую мову сайта кампаніі – добрая ініцыятыва для пашырэння аўдыторыі і паляпшэння камунікацыі з кліентамі. Нягледзячы на пазітыўны крок у бок беларускай мовы, на сайце кампаніі былі выяўлены некаторыя памылкі, якія сведчаць пра недастаткова ўважлівую працу над перакладам. У шапцы сайта слова *парфумерыя* напісана ў адпаведнасці з сучаснымі арфаграфічнымі нормамі, аднак у тэксце, змешчаным ніжэй, яно перададзена з цвёрдым губным м: *парфумэрыя*. Такое напісанне ў беларускай мове было характэрна для правапісу да 1933 г. Неаднастайнасць у напісанні, на нашу думку, звязана з тым, што ў сучаснай інтэрнэт-прасторы суіснуюць дзве правапісныя сістэмы: г. зв. «тарашкевіца» і «наркамаўка» (у прыватнасці, маюцца дзве беларускія Вікіпедыі – першая ўжывае правапіс, замацаваны ў Граматыцы Б. Тарашкевіча, другая – сучасныя акадэмічныя нормы). У сярэдзіне сказа некаторыя словы напісаны з вялікай літары, хоць з'яўляюцца агульнымі, а не ўласнымі назвамі прадметаў: *вада, раслінны, калаген*. Відавочна, гэтыя памылкі сведчаць аб выкарыстанні інтэрнэт–перакладніка. У інструкцыі фраза *«даследуйце па спасылцы ніжэй»* назіраецца лексічная неспалучальнасць слоў: правільна: *«глядзіце па спасылцы ніжэй»*, а лексема 'даследаваць' ужываецца са словамі *пытанне, стыль, мову* і г. д. [5].

Пра неабавязковасць даслоўнага перакладу піша А. А. Прасоцкая: «У сілу сваёй спецыфікі тэкст рэкламы ў рамках сайта кампаніі не варта перакладаць даслоўна. Даслоўны пераклад можа прывесці да страты

сэнсу і страты свайго пасылу, уздзеяння на рэцыпіента і асаблівага шарму» [6]. Частымі ў такім перакладзе з'яўляюцца памылкі сінтаксічнага ўзроўню, калі парушаецца парадак слоў ў сказе і губляюцца граматычныя сувязі, напрыклад: *«імгненна скура інтэнсіўна насычаная»*. Правільны пераклад мае быць: *«скура насычаецца імгненна і інтэнсіўна»*.

Кампанія «Луч» з'яўляецца вядомым вытворцам гадзіннікаў у Беларусі і мае багатую гісторыю, якая пачынаецца ў 1953 г. Сайт кампаніі сярод іншых беларускамоўных рэсурсаў вызначаецца дастаткова добрым узроўнем культуры пісьмовага маўлення. Варта адзначыць высокую моўную якасць большыні матэрыялаў-навін на гэтай анлайн-пляцоўцы, аднак некаторыя памылкі ўсё ж сустракаюцца. Напрыклад, у сказе *«За некалькі дзесяцігоддзяў было распрацавана больш за 1700 унікальных мадэляў і шэраг уласных механізмаў»* слова «шэраг» не звязана сінтаксічна з выказнікам «было распрацавана». У гэтым выпадку неабходна ўжыць яшчэ адзін выказнік: *«За некалькі дзесяцігоддзяў было распрацавана больш за 1700 унікальных мадэляў і створаны шэраг уласных механізмаў»*. Адзначана намі і арфаграфічная памылка: *«сервіс»* – сэрвіс. Тут, відавочна, скарыстана норма, замацаваная ў Тлумачальным слоўніку беларускай мовы (1983).

Некаторыя недакладнасці сустракаюцца і на сайце Белінвестбанка: арфаграфічныя памылкі кшталту ***«онлайн-сервісы»*** (анлайн-сэрвісы), лексічная – «Навіны і апавяшчэння банка». І хоць у сучасных слоўніках беларускай мовы фіксуецца лексема апавяшчаць, аднак у гэтым кантэксце адпавядаць зместу будзе слова *абвесткі* («Навіны і абвесткі банка»), пры гэтым ў слове ***апавяшчэння*** адзначаецца і марфалагічная памылка: (у назоўніках назоўнага склону множнага ліку пішацца канчатак -і – *апавяшчэнні*) і інш.

Большасць анлайн-крамаў і афлайн-крамаў, якія маюць назву свайго прадпрыемства ці пэўнай кампаніі на беларускай мове, выкарыстоўваюць сайты і акаўнты ў Інстаграм і іншых сацыяльных сетках толькі на рускай мове або перакладаюць на беларускую некаторыя катэгорыі ў спісе тавараў, гісторыю стварэння кампаніі і кантакты. Прадстаўнікамі такога прыёму з'яўляюцца «Інтэрнэт-крама» [7], «Музейная крама» [8], «Канцэпт-крама» [9], якія прадстаўляюць свой асартымент у сацыяльных сетках і на анлайн-пляцоўках. Інтэрнэт-крама зрабіла на сваім сайце толькі адзін банер на беларускай мове з прынцыпамі іх узаемадзеяння з кліенцкай базай – «Самавываз больш за 20 гарадоў», «Аплата карткай», «Беспрацэнтная растэрміноўка», «Па Беларусі ад 1 дня» [7].

Гэты банер не з'яўляецца інтэрактыўным элементам, большасці пакупнікоў, на нашу думку, будзе незразумелая канцэпцыя, калі ўвесь сайт прадстаўлены на рускай мове, а толькі невялікая «палоска тэксту» на беларускай. Дапускаем, што такая ініцыятыва можа незадаволіць пэўную частку аўдыторыі, якая хацела б бачыць аднамоўны банер.

Прадстаўнікамі іншай катэгорыі сайтаў, якія першапачатна былі арыентаваны на беларускамоўную аўдыторыю і стваралі свой сайт дзеля яе, не робячы пераклад на рускую мову ці дадаючы яе пазней, – «Калядная крама» [10], «Рагна» [11], «Аловак» [12]. На сайце крамы «Аловак» у рэкламнай навіне «Брошкі-мошкі і жучкі-завушнічкі Паўла Малаткова» [12] намі адзначаны наступныя памылкі: 1) пунктуацыйная: ужыванне працяжніка замест коскі ў складаназлучаным сказе са злучнікам *але: «Вырабы нашага новага героя здзіўляюць, прыцягваюць увагу, а кагосьці нават шакуюць – але адназначна не пакідаюць абыякавымі»* – (…а кагосьці нават шакуюць, але адназначна…); 2) арфаграфічная ў напісанні назвы навучальнай установы: *«У 2014 годзе я скончыў* ***дзяржаўную акадэмію мастацтваў*** *у Мінску…»* – («… Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў…» ці ўжыць абрэвіятуру БДАМ).

На сайце крамы «Рагна» [11] сустракаюцца наступныя недакладнасці:

1. Лексічная неспалучальнасць слоў (*...выдаткуйце і хвіліны...*) (**выдаткаваць** грошы, але: **знайсці** (аддаць) час, хвіліны).

2. Марфалагічная памылка: назоўнікі са значэннем канкрэтнасці ў родным склоне маюць канчатак *-а: «Адна з нашых мэт – забяспечыць прысутнасць сімвалаў і знакаў нашага народу ў жыцці людзей і ў звычайны дзень, і ў свята»* (…нашага народ**а…**, але: шмат народ**у**).

3. Не захавана аднастайнасць у паўторы сказаў: у шапцы сайта напісана *«А ў падзяку мы дорым Вам дадатковую зніжку 5%»,* а ніжэй у тэксце у названым сказе слова 'дорым' заменена на 'даем': *«У падзяку мы* ***даем*** *Вам дадатковую зніжку 5%»*. На першы погляд неістотная замена, сэнс сказа не парушаецца, аднак словы адрозніваюцца семантычнымі адценнямі і ў рэкламным тэксце гэтыя адценні маюць значэнне.

4. Паўтор слоў у сказе: *«Пракантралюем хаду і якасць выканання працы, даставім гатовыя* ***рэчы*** *...вырабім* ***рэчы*** *любой складанасці, нанясем Ваш лагатып»*.

5. У раздзеле «Зніжкі» прыведзены спіс пунктаў, з дапамогай якіх пакупнікі могуць удзельнічаць у бонуснай праграме, але на пачатку

пералічэння няма абагульняльнага слова: *«Прыняць удзел у нашых маркетынгавых даследаваннях…Зніжка за пост: -10% усім, хто размесціць у сваім профілі фота/тэкст пра краму… Прыйсці **за** набыткамі ў перыяды буйных традыцыйных каляндарных святаў – Вясновага і Восеньскага Раўнадзенства і Купалля і атрымаць зніжку 6%»*.Таксама ў адзначаным намі вышэй словазлучэнні са значэннем мэты дапушчана памылка: вінавальны склон патрабуе прыназоўніка *па* з дзеясловамі руху: *Прыйсці **па** набыткі…*

Як станоўчы момант варта адзначыць напісанне слова «запакоўка» ў раздзеле сайта, дзе прадстаўлены варыянты падарункавых пакетаў. Гэтая лексічная норма замацаваная ў слоўніках, аднак рэдкаўжывальная, бо ў вусным і пісьмовым маўленні пераважае «ўпакоўка», сугучная рускаму «упаковка».

Памылкі на сайце «Калядная крама» практычна не сустракаюцца, магчыма, таму, што першапачатна ўсе катэгорыі тавараў, раздзелы ў пошуку і кантакты былі напісаны на беларускай мове. Тут часткова выкарыстоўваецца лацінка, нямецкая ці ангельская мовы для напісання некаторых слоў, каб прывабіць свайго пакупніка: «Мануфактура Kaliady», «Christbaumschmuck», «Coca-Cola», «аздобы Disney». Ва ўсіх імёнах іншамоўнага паходжання дапушчана памылка ў фіналях -эр, -ус: «Гары Пот**ар**», «Герміона Грэйндж**ар**», «Гары Пот**ар** на мятле», «Люцы**юс** Малфой» [13]. Аднак, на нашу думку, такое напісанне адлюстроўвае стыхійны працэс паступовага пераходу да напісання канцавых *-ар, -аль, -юс* у названай вышэй групе слоў.

Выяўленыя памылкі на сайтах зусім не зніжаюць вартасці спробаў кампаній вярнуць беларускую мову ў грамадскі ўжытак. Гэта важны і пазітыўны крок, які дэманструе імідж кампаній, робіць іх прадукцыю пазнавальнай, «маркіраванай» для беларускага спажыўца. Разам з гэтым за такой практычнай мэтай бачацца і спробы захаваць нацыянальную мову, уласную этнакультурную ідэнтычнасць у часы глабалізацыі, узаемапранікнення культур, імкнення да агульнасці і ўніфікацыі, ва ўмовах няроўнага беларуска-рускага дзяржаўнага білінгвізму. Аднак у такой складанай для беларускай мовы сітуацыі важна, каб увага адмыслоўцаў сайтаў кампаній была звернута і на культуру пісьмовага маўлення. Гэта неабходна для пашырэння нормаў літаратурнай мовы і для павышэння агульнага ўзроўню пісьменнасці спажыўцоў беларускага кантэнту ў сеціве.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Ридченко Н.* Национальные языки в эпоху глобализации. URL: https://cyberleninka.ru (дата обращения: 14.02.2025).
2. *Плотников А. В.* Глобализация и устойчивость языков // Современные наукоемкие технологии. 2006. № 6. С. 55–56. URL: https//top-technologies/ru (дата звароту: 14.02.2025).
3. *Гуль М.* Особенности языковой политики в условиях глобализации (на примере русского и белорусского языков). URL: htpps://rep.brsu.by/bitstream//handle/ (дата звароту: 14.02.2025).
4. Вэб-сайт як аб'ект перакладу: на аснове матэрыялаў сайтаў інтэрнэт-крам адзення. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/veb-sayt-kak-obekt-perevoda-na-osnove-materialov-saytov-internet-magazinov-odezhdy/viewer (дата звароту: 26.11.2024).
5. Анлайн-крама Іў Рашэ. URL: https://www.y-r.by/ (дата звароту: 26.11.2025).
6. Прагматычныя аспекты перакладу тэкставага кантэнту сайтаў кампаній. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/pragmaticheskie-aspekty-perevoda-tekstovogo-kontenta-saytov-kompaniy/viewer (дата звароту: 26.11.2025).
7. Інтэрнэт-крама. URL: https://internet-krama.by/?srsltid=AfmBOorv_Vr5Af518k3Lf_vlaYN1MI7sJnLG40V2ZWf7sz1VuymtTQnd (дата звароту: 06.05.2025).
8. Інтэрнэт-крама. URL: https://www.instagram.com/artmuseum_shop/ (дата звароту: 06.05.2025).
9. Інтэрнэт-крама. URL: http://kanceptkrama.by/ (дата звароту: 06.05.2025).
10. Інтэрнэт-крама. URL: https://xmas.by/ (дата звароту: 06.05.2025).
11. Інтэрнэт-крама. URL: https://ragna.by/ (дата звароту: 06.05.2025).
12. Інтэрнэт-крама. URL: https://alovakmag.by/tvorcyja-ludzi/pavel-malatkou.html (дата звароту: 06.05.2025).
13. Інтэрнэт-крама. URL: https://xmas.by/catalog/harry_potter_theme/ (дата звароту: 06.05.2025).

ВАСІЛЬ ЦЯПІНСКІ (АМЕЛЬЯНОВІЧ) – БЕЛАРУСКІ ПІСЬМЕННІК ЭПОХІ РЭФАРМАЦЫІ

С. К. Берднік

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
sergejberdnik.20@gmail.com

Вывучэнне творчасці Васіля Цяпінскага дазвалае прасачыць ролю гэтай выдатнай асобы ў фарміраванні і развіцці старабеларускай мовы і культуры. Ён у «Прадмове» да Евангелля сфармуляваў уласную мастацка-эстэтычную канцэпцыю, абгрунтаваў неабходнасць грамадзянскага патрытызму, заклікаў асноўнай мовай навучання лічыць родную мову, пры гэтым не забываць вывучаць і мовы іншых народаў.

Ключавыя словы: пісьменнік; філолаг; перакладчык; патрыятызм; родная мова.

ВАСИЛИЙ ТЯПИНСКИЙ (АМЕЛЬЯНОВИЧ) – БЕЛОРУССКИЙ ПИСАТЕЛЬ ЭПОХИ РЕФОРМАЦИИ

С. К. Бердник

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
sergejberdnik.20@gmail.com

Изучение творчества Василия Тяпинского позволяет проследить роль этой выдающейся личности в формировании и развитии старобелорусского языка и культуры. Он в «Прадмове» к Евангелию сформулировал собственную художественно-эстетическую концепцию, обосновал необходимость гражданского патриотизма, призвал основным языком обучения считать родной язык, при этом не забывать изучать и языки других народов.

Ключевые слова: писатель; филолог; переводчик; патриотизм; родной язык.

Васіль Цяпінскі (каля 1540–1604) з’яўляецца выключнай асобай у славянскай і еўрапейскай культуры. З яго імем звязана ўзнікненне і развіццё новых напрамкаў у філасофіі і культуры, заснаваных на прын-

цыпах ідэнтычнасці і грамадзянскай згоды, што з'яўляецца актуальным і ў сённяшнія ў міжасобасных зносінах на розных узроўнях.

Нарадзіўся В. Цяпінскі ў маёнтку Цяпіна (цяпер Чашніцкі раён). Яго бацькі належалі да шляхецкага саслоўя. Месца атрымання адукацыі невядомае. Захаваліся толькі звесткі, што ў 1560-я гг. ён браў удзел у баявых дзеяннях пад камандаваннем аршанскага старасты Філона Кмітыа-Чарнобыльскага і падканцлера Астафея Валовіча супраць войскаў Маскоўскага княства. Вядома таксама, што таленавіты перакладчык эпохі Рэфармацыі востра палемізаваў з лідэрамі, якія прытрымліваліся камуністычных поглядаў. Асветнік адстойваў ідэю моцнай дзяржаўнай улады, быў прыхільнікам канцэпцыі ўмеранага, эвалюцыйнага ўдасканалення грамадства, выступаў супраць дагмата Троіцы. У гэтым плане Цяпінскі ў многім быў падобны да Сымона Буднага, які таксама быў прыхільнікам эвалюцыйных, паступовых пераўтварэнняў у грамадстве.

З творчай спадчыны Васіля Цяпінскага захавалася, на жаль, не так шмат таго, чым мы сёння можам карыстацца, каб глыбей асэнсаваць яго светапогляд і тыя ідэі, якія хацеў распаўсюджваць пісьменнік сярод простых людзей. Так, напрыклад, захавалася рукапісная «Прадмова» да Евангелля, адна старонка «Катехізіса, ці Сумы навукі для дзяцей у Іісусе Хрысце», а таксама няпоўны пераклад Новага Запавета з аўтарскімі каментарыямі. Усе яны былі выдадзены ва ўласнай друкарні, пра што Цяпінскі паведамляў: «У той убогай маёй друкарні ад мяне ім выдрукавана». На старонцы, якая дайшла да нашага часу, змешчана якраз назва твора: «Катэіхісіс, або Соўмы навукі для дзяцей въ Хрысце Іісусе» і дзве вытрымкі з пасланняў апосталаў Пятра і Паўла. На гэтай жа старонцы падаецца невялікае паведамленне В. Цяпінскага, у якім ён называе сябе стваральнікам «Катэхізіса…», а таксама падкрэслівае, што менавіта асабіста ён з'яўляецца перакладчыкам надрукаванага Евангелля: «Іж се імя сваё падпісваем». Непасрэдна ў тэксце Прадмовы аўтар яшчэ раз больш падрабязна акрэсліў мэты «Катэхізіса», а таксама паведаміў пра свой намер змясціць яго ў першай частцы выдання.

У «Прадмове» да Евангелля пісьменнік сфармуляваў уласную мастацка-эстэтычную канцэпцыю. Пісьменнік і перакладчык, ен перш за ўсё вызначыў місію сваёй перакладчыцкай і кнігавыдавецкай дзейнасці – служыць праўдзе і свайму народу. Васіль Цяпінскі абгрунтаваў неабходнасць грамадзянскага патрыятызму як асновы для паўнацэннага жыцця кожнага чалавека і ўсяго грамадства, супрацоўніцтва ўсіх сацыяльных саслоўяў. Патрыятызм, на яго думку, з'яўляецца надзейным

фунаментам захавання гістарычнай перспектывы народа і дзяржавы. Ён заклікаў быць адданым Радзіме, заўсёды аддана служыць Айчыне, ва ўсе часы клапаціцца пра яе працвітанне і ўзвышэнне.

Заслуга В. Цяпінскага перад беларускай культурай у тым, што ён на поўны голас заявіў пра неабходнасць развіцця пісьменнасці, літаратуры і навукі на роднай мове. Пісьменнік і перакладчык фактычна сфармуляваў грандыёзную праграму асветы народа, напрамкі развіцця нацыянальнай культуры, чым прадвызначыў галоўную тэндэнцыю духоўнай эвалюцыі грамадства.

Асноўнай мовай навучання паводле В. Цяпінскага павінна быць родная мова. Забыццё роднай мовы ў школах, – указваў ён, – найвялікшая памылка і грэх. Пры гэтым пісьменнік заклікаў вывучаць мовы іншых народаў, што, паводле яго пераканання, надзвычай спрыяе духоўнаму ўзбагачэнню людзей і працвітанню краіны. Спасылаючыся на першых славянскіх асветнікаў, якія амаль 1000 гадоў назад пераклалі Новы Запавет на славянскую мову, ён абгрунтоўваў неабходнасць перакладу Бібліі на беларускую мову.

Васіль Цяпінскі прадэманстраваў цудоўнае валоданне літаратурна–мастацкімі прыёмамі. Ён шырока выкарыстоўваў метафары, сімвалы, трапныя азначэнні, рытарычныя пытанні, яркія параўнанні. Любімы вобраз пісьменніка – «свечка», якая сімвалізуе веды, дасведчанасць, розум.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Белорусско-русский, русско-белорусский словарь / авт.-сост. А. Н. Булыко, Н. В. Полещук. 2-е изд. Минск: Попурри, 2008. 672 с.
2. Памятники литературы Беларуси X–XVIII веков / сост., лит. обраб, текста, пер. на рус.яз.: И. В. Саверченко. Минск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. 464 с.
3. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: больш за 65000 слоў / пад рэд. М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко; афармленне А. М. Хількевіча. 4-е выд. Мінск: БелЭН, 2005. 784 с.

ВІДЫ І ФУНКЦЫІ АЦЭНАЧНАЙ МЕТАНІМІІ Ў МЕДЫЯТЭКСЦЕ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ФРЭЙМА «АДУКАЦЫЯ»)

В. А. Горбач

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Gorbach_olga@mail.ru

Матэрыял прысвечаны асноўным відам ацэначнай метаніміі на прыкладзе фрэйма «адукацыя» ў медыямаўленні. Разглядаюцца функцыі метаніміі ў сучасных тэкстах СМІ Беларусі.

Ключавыя словы: метанімія; медыятэкст; фрэйм; адукацыя.

ВИДЫ И ФУНКЦИИ ОЦЕНОЧНОЙ МЕТОНИМИИ В МЕДИАТЕКСТЕ (НА ПРИМЕРЕ ФРЕЙМА «ОБРАЗОВАНИЕ»)

О. А. Горбач

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
Gorbach_olga@mail.ru

Материал посвящен основным видам оценочной метонимии на примере фрейма «образование» в медиаречи. Рассматриваются функции метонимии в современных текстах СМИ Беларуси.

Ключевые слова: метонимия; медиатекст; фрейм; образование.

Фреймовая прырода метаніміі мае на ўвазе разгляд семантычнай сумежнасці не проста як моўнай з'явы, а як кагнітыўнага працэсу, цесна звязанага з арганізацыяй ведаў у свядомасці чалавека.

Нагадаем, што фрэйм – гэта структура, у якой адлюстроўваецца тыповая сітуацыя або канцэпт з наборам слотаў (элементаў, роляў, уласцівасцяў), якія запаўняюцца канкрэтнымі значэннямі ў залежнасці

ад кантэксту. У фрэйме «адукацыя» ў якасці слотаў могуць выступаюць віды адукацыі: агульная, прафесійная, дадатковая, спецыяльная (інклюзіўная).

Метанімія, у сваю чаргу – гэта перанос значэння ўнутры аднаго фрэйма або кагнітыўнай мадэлі: сувязь усталёўваецца паміж элементамі, якія з'яўляюцца сумежнымі або суправаджальнымі ў рамках вылучанага фрэйма. У фрэйме «адукацыя» на перэферыйнай зоне выяўляюцца метанімічныя пераносы, што пабудаваны на аснове лагічнай або сітуацыйнай сумежнасці, характэрнай для вучэбнага і адукацыйнага асяродку. Асноўныя прыклады метаніміі, якія можна сустрэць у адукацыйным кантэксце, уключаюць пераносы тыпу: *аўтар – твор; месца – дзеянне ці падзея; частка – цэлае; дзеянне – вынік; прадмет – матэрыял; вучэбны працэс – месца, супрацоўнікі – установа* і інш.

Прааналізуем найбольш пашыраныя па частотнасці мадэлі метанімічных канструкцый, якія апісваюць фрэйм «адукацыя» і рэалізуюцца ў журналісцкім маўленні рознымі відамі:

1. Агульнамоўная лексічная метанімія, калі словы ўжываюцца з агульнавядомымі лексічнымі значэннямі, якія шырока прызнаныя і выкарыстоўваюцца ў мове для перадачы пэўных сэнсаў. Так, у мадэлі «Совместно с Министерством здравоохранения Беларуси пройдет День здоровья – серия просветительских мероприятий с практическими занятиями, направленными на укрепление здоровья детей и молодежи» (https://www.sb.by/) лексема *Министерство здравоохранения Беларуси* рэалізуе перанос *установа* – супрацоўнікі.

2. Дыскурсіўная лексічная метанімія – гэта разнавіднасць метаніміі, якая сумяшчае ў сабе прамое і пераноснае значэнне слова і спараджае індывідуальныя, аўтарскія метанімічныя выразы, заснаваныя звычайна на агульнапрынятых моўных мадэлях метаніміі. Напрыклад, «Республиканский «Последний звонок» собрал в Гомеле лучших выпускников из всей Беларуси» (Наст. газ., 23.05.2025), дзе спалучэнне «Последний звонок» перадае як назву мерапрыемства, так і падзею, звязаную з ёй.

3. Дыскурсіўная звышслоўная метанімія – тып метаніміі, які выходзіць за рамкі асобнага слова, які стварае тэкставыя сувязі і асацыяцыі на аснове семантычнай або кантэкстуальнай блізкасці элементаў унутры тэксту. Ужыванне метанімічнай аргументацыі ў тэксце СМІ накіравана на тое, каб уздзейнічаць на светапогляд і пачуцці так, каб прыняць пэўны пункт гледжання, што мае камунікатыўную зададзенасць у паведамленні. У канструкцыі: «Варкаўт супраць гаджэтаў: школьнікаў

Наваполацка аб'яднала спартыўная ініцыятыва «Антыгеймер» (Наст. газ., 18.12.2024) лексемы *варкаўт*, *гаджэты* праз асацыятыўны рад ў змесце падводзяць чытачоў да ідэі здаровага ладу жыцця і абмежавання выкарыстання тэхнічных прыстасаванняў дзецьмі і залежнасці ад іх.

4. Асобна варта разглядаць «метанімічныя сімвалы, у тым ліку сімвалы-паэтызмы (неба, нябёсы, труну, Вакх)» [1, с. 4]. Праз уключэнне метаніміі ў медыятэкст аўтар ярка і вобразна можа перадаць свае думкі, і, акрамя гэтага, фарміруе пэўнае ўспрыманне і стаўленне да падзеі, якую апісвае. Напрыклад, «У райцэнтры Карма таксама ёсць свой Акропаль і свой Парфенон» (Наст. газ., 10.02.2025), дзе уласныя назвы *Акропаль*, *Парфенон* перадаюць семантычную сумежнасць паміж значэннямі лексем *месца – падзеі*.

Некаторыя даследчыкі называюць асноўнымі функцыямі метаніміі ў медыятэксце: інструментальную і прагматычную. Так, інстументальная «дапамагае дадумываць інфармацыю і ствараць уласную карціну таго, што адбываецца», а прагматычная «з'яўляецца сродкам фарміравання ў адрасата неабходнага для аўтара эмацыянальнага стану і светаўспрымання» [2, с. 238]. Напрыклад, інструментальная функцыя праяўляецца ў мадэлі: «У Юрацішках спорт стаў галоўным сакрэтам школьных субот» (Наст. газ., 15.03.2024), дзе чытач самостойна можа зразумець, што хацеў сказаць аўтар у загалоўку медыятэксту.

Прагматычная роля метаніміі ў медыядыскурсе выяўляецца праз перадачу ацэнкі, дасягнутай за кошт пераносу акцэнтнай увагі. Для таго, каб выказванне не ўспрымалася «як адназначнае і катэгарычнае, рэферэнт наўмысна хаваецца або пазбаўляецца асобаснай канкрэтыкі, што дазваляе ацаніць яго ў негатыўным ключы» [2].

Прагматычная функцыя метанімічных мадэляў у медыятэксце заключаецца ў тым, каб уздзейнічаць на чытача праз выкарыстанне розных гістарычных, культурных, ідэалагічных і палітычных канатацыі, а таксама рознай ацэнкі і трансфармацый. Гэта ўздзеянне захоўвае выгляд аб'ектыўнасці, асабліва ў выпадках, калі рэферэнт застаецца нявызначаным або невядомым. Часам, ускоснае ўказанне на рэферэнта з дапамогай метанімічных канструкцый успрымаецца як нетыповае ці па-за межамі камунікатыўных нормаў.

Звернемся да адрэзку журналісцкага маўлення: *«Как Запад выкачивает* ***мозги*** *со всего мира. На протяжении веков западная цивилизация развивалась за счет активного грабежа ресурсов, добываемых подчас за тридевять земель. Колониальная эпоха стала временем разграбления*

и последующего исчезновения целых государств и цивилизаций, как это было, например, в Южной Америке. Но ныне главным ресурсом стали ***мозги****. Теперь нет нужды засылать конкистадоров: достаточно грамотных «охотников за головами», которые найдут талантливых людей и подтолкнут их к переезду в страны «золотого миллиарда»* (https://www.sb.by/31.07.2025).У прыведзеным кантэксце аўтар уключае семантычную сумежнасць (метанімію) і тым самым свядома пазбягае прамога абазначэння рэферэнта, стварае пэўную нявызначанасць і неадназначнасць, што спрыяе фарміраванню адмоўнага вобраза ў медыятэксце з дапамогай адзначанай стылістычнай фігуры, дзе ў лексемах Запад, мозги трансфармуецца пераноснае значэнне слоў, што раскрывае механізм фреймавай метаніміі. Так, доступ да адной канцэптуальнай сутнасці ажыццяўляецца праз другую, якая знаходзіцца з ёй ва ўстойлівай звязцы ў рамках вылучанага фрэйма. У метанімічным пераносе актывізуецца пэўная сумежнасць (*частка – цэлае*, *месца – дзеянне*) і запаўняецца элементамі, якія знаходзяцца ўнутры аднаго фрэйма, а не паміж рознымі канцэптуальнымі абласцямі. Падобныя пераносы на аснове метаніміі часта адлюстроўваюць спецыфіку інфармацыі, звязанай са сферай адукацыі ў медыятэксце. Фрэймавая тэорыя разглядае метанімію як спосаб арганізацыі і рэалізацыі ведаў унутры стандартных сітуацый (фрэймаў), дзе асацыяваныя адзін з адным элементы (слоты) могуць замяшчаць адзін аднаго ў мове, абапіраючыся на кагнітыўную сумежнасць.

Такім чынам, семантычная сумежнасць (метанімія), у цэлым, дапамагае лаканічна і вобразна перадаваць думкі, эканоміць словы ў інфармацыйных тэкстах, рабіць маўленне больш яркім і вобразным, пры гэтым абапіраецца на устойлівыя сувязі паміж прадметамі, дзеяннямі, месцамі і іх значэннямі, якія адаптаваны да адукацыйнага кантэксту.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Ерёмин А. Н., Петрова О. О.* Субстантивная метонимия в современном русском языке (теоретические основания и модели реализации): учебно-методическое пособие. 2-е изд. Москва: ФЛИНТА, 2018. URL: https://e.lanbook.com/book/105161 (дата обращения: 30.07.2025).
2. *Бернадская А. А.*, *Горностаева Ю. А.*, *Евсеева И. В.* Лингвистика информационно-психологической войны : монография / Красноярск : СФУ, 2020. Книга. URL: https://e.lanbook.com/book/181614 (дата обращения: 30.07.2025).

ПАЛІТЫЧНЫ ДЫСКУРС ЯК АКТУАЛЬНЫ НАВУКОВЫ НАПРАМАК

Н. А. Зубчонак

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Zubchon@bsu.by

У сучаснай інфармацыйнай прасторы па аб'ектыўных прычынах ўзрастае роля палітычнага дыскурсу. Сёння гэта не проста спосаб камунікацыі, а асобная сэнсавая прастора, якая фарміруецца і развіваецца па ўласных законах. У артыкуле прапануецца агляд некаторых навуковых падыходаў да даследавання палітычнай камунікацыі ў розных сферах сацыяльна-гуманітарных ведаў.

Ключавыя словы: палітычны дыскурс; камунікацыя; лінгвістыка; моўная дзейнасць; медыядыскурс; палітыка.

ПОЛИТИЧЕСКИЙ ДИСКУРС КАК АКТУАЛЬНОЕ НАУЧНОЕ НАПРАВЛЕНИЕ

Н. А. Зубчёнок

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
Zubchon@bsu.by

В современном информационном пространстве по объективным причинам возрастает роль политического дискурса. Сегодня это не просто способ коммуникации, а отдельное смысловое пространство, которое формируется и развивается по собственным законам. В статье предлагается обзор некоторых научных подходов к исследованию политической коммуникации в различных сферах социально-гуманитарного знания.

Ключевые слова: политический дискурс; коммуникация; лингвистика; языковая деятельность; медиадискурс; политика.

Катэгорыя дыскурсу выкарыстоўваецца сёння вельмі актыўна ў сферы такіх навуковых дысцыплін, як лінгвістыка, паліталогія, філасофія, псіхалогія, сацыялогія і інш. Вызначаюць дыскурс палітычны, сацы-

яльны, культуралагічны і інш. У кожнай сферы даследчыкі прапануюць свае азначэнні, у аснове якіх уласцівасці пэўнага тыпу камунікацыі.

Традыцыйна вывучэнне розных відаў дыскурсу адбываецца ў межах лінгвістычнай навукі. Тут жа выпрацаваны яго тэрміналагічны апарат. У апошні час можна канстатаваць павышэнне цікавасці навукоўцаў да пытанняў дыскурсу прадстаўнікоў розных сацыяльных груп і, безумоўна, палітыкаў. У дадзенай сферы мова выступае ў якасці рэсурсу, з дапамогай якога ажыццяўляецца інфармаванне грамадства, уздзеянне на яго, абмеркаванне заканадаўчых актаў і інш.

Агульнапрынятага азначэння палітычнага дыскусу пакуль не існуе, а сам тэрмін «дыскус» выкарыстоўваецца для назвы розных відаў моўнай дзейнасці. Так, вядомы галандскі даследчык Т. ван Дэйк да палітычнага дыскурсу адносіў асобны клас жанраў, абмежаваных пэўнай сацыяльнай сферай, сферай палітыкі [1]. Палітычны дыскурс у даследаваннях разглядаецца сёння не толькі як камунікацыя палітыкаў (Т. ван Дэйк, Е. І. Шэйгал), але і як самастойны навуковы напрамак (Рут Водак). Акрамя таго, у дадзеным кантэксце ўжываюцца паняцці «грамадска–палітычная мова», «агітацыйна-палітычная мова», «мова грамадскай думкі», «палітычная мова». Значны ўклад у вывучэнне тэорыі і практыкі палітычнага дыскурсу ўнеслі такія расійскія лінгвісты, як Э. У. Будаеў, А. П. Чудзінаў, Е. І. Шэйгал і інш. У працах гэтых даследчыкаў яго асаблівасці вызначаюцца, напрыклад, праз спецыфіку моўнай асобы (антропацэнтрызм); пашырэнне праблемнага моўнага поля сумежнымі (экспансіянізм); вывучэннем мовы ў працэсе дзеяння, развіцця (функцыяналізм); праз апісанне і тлумачэнне моўных з'яў і працэсаў (экспланатарнасць) [2]. Навукоўцы падкрэсліваюць, што спецыфіка палітыкі, у адроненні ад іншых напрамкаў чалавечай дзейнасці, як раз і заключаецца ў яе пераважна дыскурсіўным характары. Так, існуе меркаванне, што палітычную дзейнасць можна атаясамліваць з моўнай. У сучаснай паліталогіі назіраюцца спробы разглядаць моўны працэс не як сродак адлюстравання палітычнай рэальнасці, а як кампанент асобнага палітычнага поля [3].

Пры лінгвістычным аналізе ў дачыненні да палітычнага дыскурсу вялікае значэнне маюць форма, задачы і змест камунікатыўнага акту, а таксама лексіка. Палітычны дыскурс істотна адрозніваецца ад звычайнай мовы. Яму ўласцівы наступныя адзнакі: тэрміналагічнасць палітычнай лексікі; спецыфічная структура дыскурсу (выкарыстанне асаблівых моўных прыёмаў); спецыфічная рэалізацыя (пісьмовае альбо гукавое афармленне). Функцыя ўздзеяння мовы ў палітычным дыскурсе

рэалізуецца праз выкарыстанне пэўных моўных стратэгій, «сукупнасць моўных дзеянняў» [4].

У межах даследавання палітычнага дыскурсу вядзецца вывучэнне форм і зместу тэкстаў адпаведнай скіраванасці, моўных стратэгій і тактык палітычнай камунікацыі. Напрыклад, у залежнасці ад тэматычна-зместавага напаўнення палітычны дыскурс падзяляюць на інстытуцыянальна-палітычны, масмедыйны, агульнаўжывальны [2]. Вызначаюцца функцыі палітычнага дыскурсу: камунікатыўная, пабуджальная (апелятыўная, вакатыўная, канатыўная, рэгулятыўная, інструментальная), эматыўная, метамоўная, фактычная і інш. Важнае значэнне ў палітычнай камунікацыі належыць экспрэсіўным сродкам (напр., агрэсіі), рытарычным прыёмам. Ужыванню асобных моўных адзінак, стылістычным асаблівасцям (лінгвістычным, экстралінгвістычным, граматычным) надаецца асобная ўвага. Вывучаецца ідэалагічны аспект палітычнай камунікацыі.

Мэты палітычнай камунікацыі абумоўліваюць яе асаблівасці. Такім чынам, камунікатыўная функцыя палітычнага дыскурсу накіравана на перадачу інфармацыі з мэтай уздзеяння на свядомасць адрасата, змены карціны палітычнага свету.

Асновай даследавання мовы палітыкі, безумоўна, з'яўляецца медыядыскурс (інфармацыйныя рэсурсы друкаваных і інтэрнэт-выданняў, радыё і тэлебачання). Гэта палітычныя матэрыялы, розныя формы выступленняў, дакументы і інш.

Такім чынам, палітычны дыскурс – гэта асаблівая з'ява, якая мае вялікае значэнне ў жыцці сучаснага грамадства. У якасці навуковага паняцця – гэта даволі складаны аб'ект даследавання. Вучоныя падкрэсліваюць міждысцыплінарны характар дадзенай катэгорыі, паколькі яе задачы ўпісваюцца як у сферу лінгвістыкі, так і ў сферу іншых грамадскіх навук. У той жа час можна канстатаваць, што цікавасць да вывучэння дадзенага пытання толькі ўзрастае.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Тён А. ван Дейк.* Дискурс и власть: Репрезентация доминирования в языке и коммуникации. Пер. с англ. М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2013. 344 с.
2. *Паршина О. Н.* Российская политическая речь: Теория и практика. М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2012. 232 с.
3. *Будаев Э. В., Чудинов А. П.* Современная политическая лингвистика. Екатеринбург: Урал, 2011. 252 с.
4. *Шейгал Е. И.* Семиотика политического дискурса. М., 2004. 368 с.

КОМПАРАТИВНЫЕ КОНСТРУКЦИИ С ЭНТОМОНИМАМИ В МЕДИАТЕКСТАХ

Е. П. Козявина

Воронежский государственный университет,
Университетская площадь, 1, 394018, г. Воронеж, Россия,
office@main.vsu.ru

В данной статье проанализированы наименования насекомых в СМИ в контекстах, обнаруженных в газетном подкорпусе НКРЯ. Цель исследования – изучить образный потенциал энтомологической лексики на примере компаративных конструкций. В работе были определены признаки, которые лежат в основе сравнительных оборотов с компонентом «насекомое», сделаны некоторые выводы о развитии семантики энтомонимов в современном русском языке.

Ключевые слова: русский язык; лексика; наименования насекомых; медиатекст.

КАМПАРАТЫЎНЫЯ КАНСТРУКЦЫІ З ЭНТАМОНІМАМІ Ў МЕДЫЯТЭКСТАХ

А. П. Казявіна

Варонежскі дзяржаўны ўніверсітэт,
Універсітэцкая плошча, 1, 394018, г. Варонеж, Расія,
office@main.vsu.ru

У дадзеным артыкуле прааналізаваны найменні насякомых у СМІ ў кантэкстах, выяўленых у газетным падкорпусе НКРМ. Мэта даследавання – вывучыць вобразны патэнцыял энтамалагічнай лексікі на прыкладзе кампаратыўных канструкцый. У працы былі вызначаны прыкметы, якія ляжаць у аснове параўнальных зваротаў з кампанентам «насякомае», зроблены некаторыя высновы аб развіцці семантыкі энтамонімаў у сучаснай рускай мове.

Ключавыя словы: руская мова; лексіка; найменні насякомых; медыятэкст.

Наименования насекомых являются частью анималистической, или зоонимической лексики. Это древнейший пласт лексики, который может дать представление об особенностях культуры и языка человека. Наименования насекомых, или энтомонимы, часто используются для характеристики качеств человека, поскольку обладают образностью. Особенно востребован образный и оценочный потенциал энтомологической лексики, заключенный в сравнительных оборотах и метафоре, в медиатекстах. Образный аспект анималистической лексики уже рассматривался в работах В. Мусси, 2014 [1], А. В. Дыбо, 2019 [2], О. В. Мерзликиной, 2021 [3], С. Б. Козинца, 2022 [4], Н. А. Сегал, 2024 [5].

Актуальность нашего исследования определяется особенностями проанализированного дискурса – медиадискурса, представленного в НКРЯ газетным подкорпусом.

В. Н. Телия в работе «Метафора в языке и тексте» отмечает: «Было бы чрезвычайно ценно для лингвистики, психологии, теории познания выявить закономерности переноса понятий из одной сферы в другую, отражающуюся в изменениях значений слов. Например, названия животных при перенесении на людей обычно обозначают их внешний вид или черту характера (лошадь, медведь, осел, мокрая курица и т. п.), при перенесении же в сферу материальных предметов названия животных обозначают различные несложные механизмы и приспособления (кошка, журавль, собачка, козлы, спортивный конь и т. п.)» [6, с. 18].

Целью данного исследование является изучение образного потенциала энтомологической лексики в медиатексте на материале российских СМИ. На первом этапе работы нами был сформирован корпус энтомонимов. Источником послужил «Малый академический словарь» под ред. А. П. Евгеньевой [7], в котором обнаружено 53 номинации, где в дефиниции встречается лексема «насекомое». На втором этапе был произведен поиск по разделу «Газетные СМИ» Национального корпуса русского языка [8], в ходе которого были обнаружены контексты, содержащие в себе сравнительные конструкции, обнаруживающие некоторые устойчивые признаки, связанные в сознании носителя русского языка с тем или иным насекомым. Выявлено, что из 53 энтомонимов только 21 номинация встречается в текстах российских СМИ НКРЯ и содержит оценочные характеристики. Общее количество обнаруженных контекстов – около тысячи. Собранный и проанализированный нами корпус

энтомонимов отражает образный потенциал энтомонимов в текстах российских СМИ.

Отметим, что выбранные нами контексты со сравнительными оборотами могут иметь метафорическое значение. «Под сравнением, или сопоставлением, принято понимать рассмотрение объектов для установления моментов сходства и различия. В контексте теории сравнения считается, что по своей номинативной технике метафора представляет собой имплицитное сравнение. Такое «имплицитное сравнение» соотносимо с компаративной конструкцией. Таким образом, метафора и сравнение находятся в отношениях производности» [9, с. 51].

Г. Н. Скляревская в работе «Метафора в системе языка» выделяет следующие семантические виды языковой метафоры: мотивированная, синкретическая, ассоциативная. Отмечается, что «мотивирующий механизм метафорического переноса обнаруживается в сравнении – когда сравнительный оборот и соотносимая с ним метафора функционируют в языке синхронно в одной словарной статье. Словарные статьи такого рода отражают процесс формирования метафоры вообще: на основе коннотативного признака (реализованного в данном случае в сравнении) к образованию метафорического значения и к его лексическому закреплению. Например: *Теленок*. В сравн. *Кроток и добродушен, как теленок. Молчит, как теленок*. Перен. О безответном и глуповатом человеке» [10, с. 50].

Перенос признаков насекомого на человека – это регулярный способ образования сравнения и метафоры. Аспектом сравнения (см. ниже табл. 1) зачастую выступают следующие признаки: внешний вид, количество, особенности поведения (способы передвижения, способность кусать, лень, трудолюбие). В НКРЯ обнаружены следующие контексты, которые можно классифицировать по аспектам сравнения. Наиболее крупная группа энтомонимов связана с поведенческими характеристиками, например, *«слетались, как бабочки на огонь»*. В данной группе можно выделить особенности передвижения: *«прыгает, как блоха»*, *«запрыгает, как кузнечик»*, *«разбегаются как тараканы»*, *«кружит, как шмель»*, *«порхает, как стрекоза»*; многочисленность: *«плодятся, как вши»*, *«расплодились, как клопы»*, *«лезут, как клопы»*, *«множатся, как тараканы»*; беспомощность: *«раздавить, как букашку»*, *«раздавит, как жука»*, *«мрут, как мухи»*; трудолюбие: *«трудятся, как муравьи»*, *«работают, как пчелы»*; лень: *«сижу на шее, как трутень»*; способность кусать: *«жалит, как оса»*, *«подтачивает, как червь»*, *«изгрыз,*

как червь», *«сожрали, как саранча»*. Признак количества отмечен в следующих контекстах, содержащих энтомонимы: *«плодятся, как вши»*, *«расплодились, как клопы»*, *«лезут, как клопы»*, *«множатся, как тараканы»*, *«у нас их, как тараканов»*, *«их тучи, как мошкары»*. Единичный оборот связан с особенностями внешнего вида: *«закутанная, как куколка»*.

При мотивационном анализе В. П. Москвин предлагает выделять вспомогательный субъект (компаратор) и основной субъект (компарант), а также дополнительные аспекты: аспект сравнения и общий признак [9, с. 50]. Используя данную классификацию, энтомонимы, которые содержатся в проанализированных нами контекстах российских СМИ, можно представить в таблице.

Энтомонимы газетного подкорпуса НКРЯ

Вспомогательный субъект	Основной субъект	Общий признак	Аспект сравнения
бабочка	человек	«слетелись»	поведение
блоха	мысль	«прыгали»	способ передвижения
букашка	человек	«задавят»	беспомощность
вошь	мафия	«стала плодиться»	многочисленность
жук	человек	«раздавит»	беспомощность
клоп	человек	«расплодилось»	многочисленность
комар	человек	«убивает»	беспомощность
кузнечик	человек	«запрыгает»	способ передвижения
куколка	человек	«закутанная»	внешний вид
мошка	душа	«слетаются»	способ передвижения
мошкара	человек	«вьются»	способ передвижения
муравей	человек	«трудятся»	трудолюбие
муха	человек	«мрут»	беспомощность

Окончание таблицы

Вспомогательный субъект	Основной субъект	Общий признак	Аспект сравнения
оса	человек	«жалит»	способность кусать
пчела	человек	«работает»	трудолюбие
саранча	человек	«набрасывается»	способ передвижения
стрекоза	человек	«порхает»	способ передвижения
таракан	человек	«разбегались»	способ передвижения
трутень	человек	«сижу на шее»	лень
червь	стоимость	«подтачивает»	способность кусать
шмель	самолет	«кружит»	способ передвижения

Контекстный анализ позволяет сделать вывод о том, что энтомонимы активно используются для характеристики человека как представителя социума, конкретных предметов и абстрактных сущностей. Однако основные тенденции в развитии семантики энтомонимов в русском языке имеют антропонимическую направленность, поскольку частотно использование наименований насекомых, отражающих наблюдения за поведением человека.

В связи с этим мы можем говорить о том, что номинации насекомых обладают богатым образным потенциалом и активно используются в языке российских СМИ, что несомненно ведет к расширению семантики энтомонимов и закреплению некоторых устойчивых сочетаний в языке. Поскольку СМИ формируют национальную картину мира и отражают особенности современного языка, на примере медиатекстов возможно отследить вектор развития семантики энтомологической лексики.

Библиографические ссылки

1. *Мусси В.* Семантические и лингвокультурологические аспекты изучения энтомологических метафор в русском языке (в сопоставлении с итальянским) : дисс. … канд. фил. наук: 10.02.01. Новосибирский государственный педагогический университет, Новосибирск, 2014. 262 с.

2. *Дыбо А. В.* Зооморфная метафора «медведь» в русском, английском и языках Южной Сибири / Е. В. Никуленко. Текст : непосредственный // Язык и культура. 2019. № 45. С. 78–95.
3. *Мерзликина О. В.* Зооморфные метафоры «домашний скот» в русской и галисийской языковых картинах мира / Текст : непосредственный // Вестник Томского государственного университета. Филология. 2021. № 71. С. 114–132.
4. *Козинец С. Б.* Зоонимы в образном пространстве языка: метафора, сравнение, фразеологизм // Известия Саратовского университета. Новая серия. Серия: Филология. Журналистика. 2022. Т. 22, вып. 3. С. 254–260.
5. *Сегал Н. А.* Зоонимичная метафора как средство моделирования современных политических реалий (на примере образа обезьяны) / Текст : непосредственный // Политическая лингвистика. 2024. № 1(103). С. 12–20.
6. *Телия В. Н.* Метафора в языке и тексте. М.: Наука, 1988. 176 с.
7. Словарь русского языка: В 4-х т. / АН СССР, Ин-т рус. яз; Под ред. А. П. Евгеньевой. 3-е изд., стереотип. М.: Рус. яз., 1985.
8. *Москвин В. П.* Русская метафора: Очерк семиотической теории. Изд. 2-е, перераб. и доп. М. : ЛЕНАНД, 2006. 184 с.
9. Национальный корпус русского языка. URL: https://ruscorpora.ru. (дата обращения: 16.04.2025).
10. *Скляревская Г. Н.* Метафора в системе языка. СПб. : Филологический факультет СПбГУ, 2004. 166 с.

АСНОЎНЫЯ ТЫПАЛАГІЧНЫЯ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ХРЭСТАМАТЫЙ XXI СТ. ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАГА ПІСЬМА

У. І. Куліковіч

Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,
вул. Свярдлова, 13А, 220050, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
nino1924kul@gmail.com

Даследаванне прысвечана асэнсаванню тыпалагічных рыс вучэбнай літаратуры. На матэрыяле трох хрэстаматый, створаных у БДУ, устаноўлены адметнасці чытацкага адрасу, функцыянальнага прызначэння, структуры выданняў і кампазіцыйных элементаў аўтарскіх артыкулаў, іх актуальнасць, наяўнасць/адсутнасць электроннай версіі вучэбнага дапаможніка.

Ключавыя словы: арфаграфія; графіка; хрэстаматыя; рэдактарская падрыхтоўка; тыпалогія выданняў; вучэбная літаратура.

ОСНОВНЫЕ ТИПОЛОГИЧЕСКИЕ ХАРАКТЕРИСТИКИ ХРЕСТОМАТИЙ XXI В. ДЛЯ ИЗУЧЕНИЯ БЕЛОРУССКОГО ПИСЬМА

В. И. Куликович

Белорусский государственный технологический университет,
ул. Свердлова, 13А, 220050, г. Минск, Республика Беларусь,
nino1924kul@gmail.com

Исследование посвящено осмыслению типологических черт учебной литературы. На материале трех хрестоматий, созданных в БГУ, установлены особенности читательского адреса, функционального назначения, структуры изданий и композиционных элементов авторских статей, их актуальность, наличие/отсутствие электронной версии учебного пособия.

Ключевые слова: орфография; графика; хрестоматия; редакторская подготовка; типология изданий; учебная литература.

У навуковай літаратуры пад тэрмінам хрэстаматыя (греч. chrestomatheia, от chrestos – карысны і manthno – вучуся) разумеюць вучэбную кнігу, дзе ў сістэматызаваным выглядзе пададзены літаратурна–мастацкія, афіцыйныя, навуковыя і іншыя творы або ўрыўкі з іх,

якія з'яўляюцца аб'ектам вывучэння пэўнай дысцыпліны ў школе ці ўстановах вышэйшай адукацыі (УВА) [1, с. 579]. Такое выданне прызначаецца, як правіла, для пашырэння ведаў чытача і павінна змяшчаць інфармацыю, якую тэзісна або схематычна прэзентуюць у сабе асноўныя падручнікі ці вучэбныя дапаможнікі.

Нягледзячы на асобныя недахопы, значэнне хрэстаматый, створаных з улікам развіцця новых педагагічных тэхналогій, цяжка пераацаніць у адукацыйным працэсе. У спалучэнні з асноўнай літаратурай яны фарміруюць уяўленне студэнта пра узорныя, эталонныя работы ў прадметнай сферы; развіваюць аналітычныя і крытычныя навыкі пры параўнанні тэкстаў; садзейнічаюць выпрацоўцы ўласнай пазіцыі па важных пытаннях навукі і культуры; спрыяюць стварэнню свайго навукова-практычнага даследавання.

Патрэба ў такім даследаванні абумоўлена распрацоўкай на кафедры рэдакцыйна-выдавецкіх тэхналогій спецыяльнай тэматычнай хрэстаматыі «Дынаміка нормаў беларускай мовы. Графіка і арфаграфія». Вынікі аналізу існаваных вучэбных дапаможнікаў дазволяць унесці шэраг станоўчых элементаў у праектаванае выданне, будуць спрыяць пашырэнню вопыту, эрудыцыі не толькі аўтара-складальніка, але і рэдактара – спецыяліста кніжнай справы, ад якога патрабуюцца ўменні, навыкі праектаваць і канструяваць выданне, быць яго непасрэдным выканаўцам, арганізатарам і кіраўніком. Практычны досвед артыкула можа быць выкарыстаны ў практыцы выкладання ва УВА, пры распрацоўцы спецкурса па складанні і рэдагаванні хрэстаматый. Праект можа быць цікавы шырокаму колу чытачоў: студэнтам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, якія спецыялізуюцца на вывучэнні выдавецкай справы і паліграфіі, выдаўцам і супрацоўнікам выдавецтваў, удзельнікам студэнцкіх навуковых гурткоў.

Намі было выяўлена 18 хрэстаматый, створаных цягам XX і XXI стст, прысвечаных вывучэнню беларускай мовы. З іх 13 змяшчаюць дыялектны матэрыял, а таксама тэксты розных стыляў у розныя перыяды існавання беларускай мовы. Да такіх работ адносяцца, напрыклад, выданні: *Бубновіч І. І. Гісторыя беларускай мовы: хрэстаматыя / І. І. Бубновіч, Н. К. Памецька, Ж. С. Сіплівеня. Гродна: ГрДУ, 2009. 239 с.; Хрэстаматыя па беларускай дыялекталогіі: Цэнтральная зона / НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. імя Я. Коласа і Я. Купалы; уклад. В. Д. Астрэйка [і інш.]; навук. рэд. Л. П. Кунцэвіч, В. М. Курцова. Мінск: Беларус. навука, 2009. 529 с.; Хрэстаматыя па гісторыі беларускай*

мовы / АН Бел. ССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. Мінск: Выд-ва акадэміі навук БССР, 1961. 865 с. і іншыя.

Мы ж спынімся на сціслай характарыстыцы толькі трох, якія маюць пэўнае дачыненне і падабенства да праектаванага намі выдання.

Першая з іх *Беларуская мова: хрэстаматыя: вучэб. дапам. / аўт.-склад.: З. І. Бадзевіч [і інш.]. Мінск: Юнипресс, 2005. 592 с.* У хрэстаматыю ўключаны выбраныя працы па ўсіх раздзелах курсаў «Сучасная беларуская мова» «Стылістыка і культура беларускай мовы». Пры падборы артыкулаў, як сцвярджаецца ў прадмове, аўтары-ўкладальнікі кіраваліся двума прынцыпамі: навуковай вартасцю працы і яе лінгва–дыдактычным патэнцыялам. Чытацкі адрас хрэстаматыі – вучні старшых класаў агульнаадукацыйных школ, ліцэяў, гімназій, настаўнікі і студэнты. Раздзел «Арфаграфія» прадстаўлены шасцю матэрыяламі: невялікім фрагментам (1 с.) з кнігі «Беларуская граматыка для школ» (1918 г.) Б. Тарашкевіча; фрагментам з кнігі І. Я. Лепешава «Сучасная беларуская літаратурная мова: Спрэчныя пытанні» (2002); артыкулам Л. М. Шакуна «Роля Б. А. Тарашкевіча ў развіцці беларускай літаратурнай мовы»; артыкулам А. І. Падлужнага «Цяжкія выпадкі правапісу е, я ў ненаціскных складах» (гэты артыкул змяшчаюць часта і складальнікі іншых хрэстаматый, што на наш погляд, рабіць не варта); артыкулам М. Р. Судніка «Пытанні арфаграфіі і моўная практыка адносна напісання слоў не рэгламентаваных арфаграфічна»; артыкулам Л. І. Сямешкі «Кадыфікацыя арфаграфічных норм». Характэрнымі рысамі гэтай хрэстаматыі, на наш погляд, можна лічыць: 1) актуальнасць артыкулаў, змест якіх адлюстроўвае складаныя выпадкі напісання асобных слоў; 2) электронная версія, змешчаная ў свабодным доступе; 3) адсутнасць прадмовы да кожнага раздзела, у якой былі б акрэслены прынцыпы адбору матэрыялу; 4) адсутнасць інфармацыі пра аўтараў; 5) адсутнасць кантрольных пытанняў і заданняў, што, як паказала практыка і даследаванні псіхолагаў, істотна ўплывае на якасць засваення матэрыялу.

Другая кніга *Гісторыя беларускага мовазнаўства (1918–1941) : хрэстам. для студ. філ. фак. : у 2-х ч. / аўт.-склад. С. М. Запрудскі, Г. І. Кулеш. Мінск: БДУ, 2005*. У гэтым выданні маецца асобны раздзел пад назвай «Распрацоўка правапісу ў 1920-я г.». Ён цалкам прысвечаны дыскусіям адносна беларускага правапісу, што адбываліся падчас працы Акадэмічнай канферэнцыі 1926 г. Тут змешчаны: інфармацыя пра Акадэмічную канферэнцыю па рэформе беларускага правапісу і азбукі;

артыкул Я. Лёсіка «Да рэформы нашай азбукі»; выступленні ў дыскусіі аб рэформе азбукі Я. Лёсіка; артыкул Я. Лёсіка «Да рэформы беларускага правапісу»; артыкул С. Некрашэвіча «Да пытання аб рэформе нашага правапісу»; заява Я. Лёсіка, Я. Коласа, А. Лёсіка і Я. Купалы ў Прэзідыум правапіснай камісіі; артыкул К. Езавітава «Справаздача аб рабоце правапіснай камісіі»; рэзалюцыя аб рабоце Акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі; Заключнае слова У. Ігнатоўскага; прамова М. Фасмера на заключным пасяджэнні канферэнцыі.Характэрнымі рысамі гэтай хрэстаматыі з'яўляюцца наступныя: 1) актуальнасць артыкулаў, змест якіх адлюстроўвае складаныя пытанні станаўлення і выпрацоўкі арфаграфічных нормаў беларускай мовы ў 20-я г. XX ст.; 2) электронная версія, змешчаная ў свабодным доступе ў электроннай бібліятэцы БДУ; 3) наяўнасць уводзінаў да кожнага раздзела, дзе тлумачацца прынцыпы адбору матэрыялаў іх вартасць; 4) наяўнасць інфармацыі пра аўтараў; 5) адсутнасць пытанняў і заданняў пасля кожнага тэксту.

Трэці вучэбны дапаможнік *Сучасная беларуская мова. Хрэстаматыя: дапаможнік. У 2 ч. Ч. 1. Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія. Лексікалогія. Лексікаграфія. Фразеалогія. Марфеміка. Марфаналогія. Словаўтварэнне. Марфалогія / склад.: А. Л. Садоўская [і інш.]. Мінск: БДУ, 2022. 319 с.* У склад гэтага дапаможніка ўваходзяць навуковыя публікацыі і фрагменты навуковых і навукова-метадычных работ, змест якіх адпавядае праграме навучальных дысцыплін модуля «Сучасная беларуская мова». Тэксты, якія змяшчаюцца ў кнізе, прызначаны для выкарыстання ў педагагічным працэсе ва УВА пры падрыхтоўцы студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей з мэтай садзейнічаць фарміраванню неабходных прафесійных уменняў і навыкаў. У выданні маецца раздзел, што дазваляе вывучаць сістэму беларускага пісьма. Ён называецца «Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія». Тут графіка і арфаграфія беларускай мовы прэзентуюцца чатырма артыкуламі: Яновіч А. І. Станаўленне графічнай сістэмы беларускай літаратурнай мовы новага перыяду (с. 78–83); Іўчанкаў В. І. Закон «Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (с. 84–92); Іўчанкаў В. І. Фіналі *-аль, -ар* у медыйнай практыцы (с. 93–96), Кандраценя, І. У., Кунцэвіч Л. П., Лукашанец А. А. Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі (с. 97–103).Асноўных тыпалагічных характарыстык выдання таксама пяць: 1) наяўнасць электроннай версіі ў электроннай бібліятэцы БДУ; 2) функцыянальнае прыз-

начэнне – дапамагчы выкладчыку выбраць педагагічна мэтазгодныя шляхі і формы работы са студэнтамі, а таксама пасадзейнічаць развіццю базавых і прадметных кампетэнцый студэнтаў і сістэматызаваць веды аб асноўных лінгвістычных законах, розных падыходах да тлумачэння моўных з'яў; 3) тэксты артыкулаў забяспечаны мінімальным апаратам (назва артыкула, аўтар, спіс літаратуры) і з'яўляюцца дадатковым навучальным матэрыялам да навучальных і вучэбна-метадычных дапаможнікаў па дысцыплінах модуля «Сучасная беларуская мова»; 4) адсутнасць фотаздымкаў аўтараў, звестак пра аўтараў, а таксама пытанняў і заданняў пасля тэкстаў; 5) падзел кнігі на часткі ў адпаведнасці з тэматычным прынцыпам: маюцца ўводзіны, дзе сабраны артыкулы аб функцыянаванні беларускай літаратурнай мовы, а таксама наступныя раздзелы: Фанетыка. Фаналогія. Арфаэпія. Графіка. Арфаграфія; Лексікалогія; Лексікаграфія; Фразеалогія; Марфеміка; Марфаналогія; Словаўтварэнне; Марфалогія з падраздзеламі: Назоўнік. Прыметнік. Лічэбнік. Займеннік. Дзеяслоў. Дзеепрыметнік. Дзеепрыслоўе. Прыслоўе. Безасабова – прэдыкатыўныя словы.

Такім чынам, можна сцвярджаць што пры падрыхтоўцы хрэстаматый, дзе маюцца матэрыялы, прысвечаныя беларускаму пісьму, аўтары-складальнікі – выкладчыкі БДУ, адрасуюць іх найперш студэнтам-філолагам і настаўнікам беларускай мовы і літаратуры. Кожная са створаных хрэстаматый мае электронную версію, размешчаную ў электроннай бібліятэцы БДУ, што значна спрашчае пошук інфармацыі і працу з ёй. Прапанаваныя ў выданні артыкулы на высокім навукова-практычным узроўні захоўваюць і транслююць традыцыі акадэмічнай культуры, служаць прыкладам кваліфікаванага навуковага адбору матэрыялу, выконваюць адукацыйна-выхаваўчую функцыю. Структура і афармленне артыкула хрэстаматыі аднатыпныя: за выключэннем хрэстаматыі С. Запрудскага і Г. Кулеш, дзе маюцца сціслыя звесткі пра аўтараў, астатнія выданні такога апаратнага элемента не ўтрымліваюць, як не ўтрымліваюць сродкаў візуалізацыі (напрыклад, фотаздымкаў аўтараў), пытанняў і заданняў для самаправеркі.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Книговедение: энциклопедический словарь / Ред. коллегия: Н. М. Сикорский (гл. ред.) и др. М. : Сов. энциклопедия, 1982. 664 с.

БЕЛАРУСКІ ПУБЛІЦЫСТЫЧНЫ ТЭКСТ У ПЕРЛАКУТЫЎНЫМ АСПЕКЦЕ

Ю. В. Маліцкі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
Malitski@bsu.by

Разглядаюцца асаблівасці беларускага публіцыстычнага тэксту ў аспекце рэалізацыі яго перлакутыўных характарыстык. Даецца рэтраспектыва развіцця беларускага публіцыстычнага тэксту, вылучаюцца яго асноўныя мэтавыя прагматычныя ўстаноўкі ў сувязі з падзеямі айчыннай гісторыі, аналізуюцца зместава-фармальныя сродкі маўленчай актуалізацыі рыс грамадскай функцыянальнасці.

Ключавыя словы: тэкст; публіцыстычны тэкст; лакуцыя; ілакуцыя, перлакуцыя.

БЕЛОРУССКИЙ ПУБЛИЦИСТИЧЕСКИЙ ТЕКСТ В ПЕРЛОКУТИВНОМ АСПЕКТЕ

Ю. В. Малицкий

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
Malitski@bsu.by

Рассматриваются особенности белорусского публицистического текста в аспекте реализации его перлокутивных характеристик. Дается ретроспектива развития белорусского публицистического текста, выделяются его основные целевые прагматические установки в связи с событиями отечественной истории, анализируются содержательно-формальные средства речевой актуализации черт общественной функциональности.

Ключевые слова: текст; публицистический текст; локуция; илокуция, перлокуция.

Логіка гістарычнай трансфармацыі беларускага тэксту (пад гэтым паняццем мы разумеем беларускамоўны тэкст) вызначаецца канкрэтнымі падзеямі і этапамі развіцця беларускай нацыі. На гэтым шляху ён выступаў сродкам непасрэднага ўплыву на аб'ектыўны стан рэчаў, а, часам – і дзейсным інструментам канструявання рэальнасці. Выразная функцыянальная скіраванасць вызначала асноўныя прынцыпы маўленчай арганізацыі тэксту – шляхі выкладу і структуравання інфармацыі, характар выбудоўвання логікі зместава-кампазіцыйных сувязей, спосабы выяўлення аўтарскіх адносін да з'яў рэчаіснасці, арсенал мастацкіх прыёмаў, склад маўленчых сродкаў, адэкватных камунікатыўным абставінам, мэтавай аўдыторыі і г. д. Вытокі тэкстаў, што мелі першачарговай мэтай данясенне інфармацыі і фарміраванне ў чытача пэўных адносін да яе, бяруць пачатак у часы распаду Кіеўскай Русі. Сярод іх «Слова аб Законе і Благадаці» мітрапаліта Іларыёна (сярэдзіна XI ст.), «Казанне пра Барыса і Глеба» (XI–XII ст.), «Аповесць мінулых гадоў» (пачатак XII ст.), «Слова аб палку Ігаравым» (XII ст.), «Жыціе Ефрасінні Полацкай», «Жыціе Аўрамія Смаленскага» (XII–XIII ст.) і інш. Названыя творы засведчылі пачатак фарміравання сістэмы спосабаў канструявання тэкстаў у сувязі з іх функцыянальным прызначэннем.

Нягледзячы на нязначны ўплыў, які аб'ектыўна былі здольныя аказаць існуючыя ў адзінкавых экзэмплярах старажытныя рукапісныя творы на пераважна непісьменнае грамадства, відавочным з'яўляецца тое, што ў сілу тагачасных уяўленняў аб сакральнасці пісьменства на іх ускладалася важная функцыя легітымізацыі існуючай улады, пацвярджэння правамернасці яе дзеянняў.

Публіцыстычнасць тэксту як арганізацыйны прынцып твораў беларускай літаратуры і як інструмент ўплыву на аб'ектыўную рэчаіснасць больш поўна выявілася ў XVI–XVII ст. Рэлігійна-ідэалагічнае супрацьстаянне каталіцызму і праваслаўя на этнічных беларускіх землях, наступствы Берасцейскай уніі (1596) паслужылі магутным рухавіком для з'яўлення старабеларускіх тэкстаў, прысвечаных нацыянальна-рэлігійным праблемам Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Займаючы актыўную грамадзянскую пазіцыю, абараняючы культурныя і палітычныя інтарэсы насельніцтва беларускіх зямель у часы Рэфармацыі і Контррэфармацыі, аўтары каментарыяў да богаслужэбных тэкстаў, памфлетаў, зваротаў, адкрытых лістоў, трактатаў, адозваў

і іншых форм тагачаснай грамадскай камунікацыі адстойвалі права народа на рэлігійнае самавызначэнне, узнімалі пытанні арганізацыі дзейнасці царквы як сацыяльнага інстытута, прама ці ўскосна закранаючы праблемы класавай няроўнасці, эканамічнай эксплуатацыі, нацыянальнага прыгнёту і г. д. Беларуская палемічная літаратура эпохі Рэнесансу канчаткова сфарміравала ўяўленне аб тэксце як аб форме ідэалагічнай барацьбы і інтэлектуальнай зброі.

Тэктанічныя сацыяльныя і эканамічныя зрухі ў сярэдзіне XIX ст. вызначылі адпаведныя гістарычным абставінам формы звароту да насельніцтва беларускіх земляў. На пярэдадні і пасля выхаду лёсавызначальнага маніфеста 1861 г. «О всемилостивейшем даровании крепостным людям прав состояния свободных сельских обывателей» папулярным сродкам грамадскай камунікацыі сталі так званыя гутаркі – белетрызаваныя мастацка-публіцыстычныя творы выразнай сацыяльнай накіраванасці. Ва ўмовах, калі беларускае слова было выцеснена з афіцыйнага грамадскага ўжытку, яны надалі народна-гутарковай мове статус сродку агульнанацыянальнай камунікацыі і заклалі базавыя прынцыпы фарміравання айчыннай інфармацыйнай прасторы. Яны ў даступнай форме раскрывалі сутнасць сацыяльных і эканамічных змен, спрыялі фарміраванню пункту погляду беларускага сялянства на гэтыя змены.

Цэнтральнае месца ў грамадска-палітычнай тэматыцы айчынных выданняў пачатку XX ст. заняла ідэя адраджэння беларускай дзяржавы. У 1906 г. пачала выходзіць газета «Наша доля». Кожны перадавы артыкул газеты быў значнай вяхой у развіцці айчыннай публіцыстыкі. Артыкулы «Што будзе» і «Даход расейскага цара» высока ўзнялі стандарты беларускай аналітыкі, а рэзанансны артыкул «Як мужыку палепшыць сваё жыццё», надрукаваны ў другім і трэцім нумарах, стаў сапраўднай інструкцыяй у справе стварэння саюзаў працоўных і сялян для барацьбы за лепшае жыццё.

Першыя два дзесяцігоддзі савецкай улады без перабольшання можна назваць пачаткам пабудовы беларускай дзяржавы ў новых гістарычных умовах, і перыядычныя выданні сталі эфектыўным інструментам гэтага працэсу. Значнай падзеяй у фарміраванні сістэмы беларускіх сродкаў масавай інфармацыі была дзейнасць першай савецкай беларускамоўнай газеты «Дзянніца» (пачала выдавацца ў пачатку 1918 г.). Рэдакцыя газеты падтрымлівала і развівала ідэю стварэння беларускай дзяржаўнасці,

тлумачыла чытачам асноўныя задачы беларусаў у справе ўмацавання заваёў Кастрычніцкай рэвалюцыі і дасягнення самавызначэння рэспублікі. Аўтарытэт выдання ў вялікай ступені быў абумоўлены асобай рэдактара – вядомага пісьменніка і публіцыста Зміцера Жылуновіча. Ён быў аўтарам праграмных артыкулаў, прысвечаных дзяржаўнаму ўладкаванню («Аб нацыянальным руху», «Нашы задачы» і інш.). Творы З. Жылуновіча мелі выразны аналітычны і навукова-тэарэтычны характар і аказалі істотны ўплыў на ход палітычнага працэсу ў Беларусі.

Вектар функцыянальнай скіраванасці беларускай публіцыстыкі часоў Вялікай Айчыннай вайны відавочны. Праграмныя перадавыя артыкулы выданняў ваеннага часу падтрымлівалі полымя ідэйнай барацьбы супраць фашызму, даводзілі думку аб непазбежным вызваленні беларускай зямлі ад гітлераўскіх акупантаў. Асаблівае месца ў працэсе развіцця беларускамоўнага публіцыстычнага тэксту займае дзейнасць франтавой газеты «За Савецкую Беларусь», якая выходзіла з ліпеня 1941 г. па снежань 1942 г. Адметнай рысай газеты сталі навіны партызанскага руху на Беларусі, глыбокая аналітыка па пытаннях міжнароднага становішча. Такія матэрыялы пашыралі ракурс погляду чытача на падзеі, фарміравалі ўяўленне аб змаганні беларусаў у партызанскіх атрадах і ў Чырвонай Арміі як аб укладзе ў сусветную барацьбу з фашызмам.

Асноўным вынікам першых пасляваенных дзесяцігоддзяў стала паспяховае пераадоленне савецкім грамадствам наступстваў вайны. Важную ролю ў гэтым адыгрываў беларускі друк і радыёвяшчанне, якія былі важным фактарам канструявання сацыяльных працэсаў і аб'ектыўных пераўтварэнняў. Магістральным напрамкам айчыннай публіцыстыкі ў гэты перыяд стала вырашэнне актуальных пытанняў народнай гаспадаркі. У 1950-х гг. гэта былі пытанні аднаўлення і росту аб'ёмаў вытворчасці, вырабу ў неабходнай колькасці электраэнергіі для прамысловых прадпрыемстваў і сельскай гаспадаркі. У 1960-х гг. у фокус увагі беларускіх публіцыстаў трапіла праблема дэмаграфіі беларускай вёскі, адток моладзі ў горад, у 1970-х – пытанні жыллёвай палітыкі і горадабудаўніцтва.

Працэсы дэмакратызацыі савецкага грамадства ў другой палове 1980-х гг., сталі прычынай карэкцыі сацыяльнага статусу сродкаў масавай камунікацыі і істотным чынам паўплывалі на прынцыпы публіцыстычнай дзейнасці. Галоснасць як вызначальны прынцып перабудовы зрабіў адкрытымі для абмеркавання ў прэсе такія вост-

рыя грамадскія праблемы, як аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі і яе наступствы для нашай краіны, рэпрэсіі супраць беларускай навуковай і творчай эліты ў 1930–50-я гг. і інш. Пашырэнне тэматычнага спектра айчыннай публіцыстыкі паспрыяла росту цікавасці да гісторыі Беларусі, што ў выніку падрыхтавала ідэалагічную базу для абвяшчэння суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Сёння аналітычныя, дыскусійныя тэксты сацыяльнай накіраванасці не згубілі сваёй ролі і па-ранейшаму з'яўляюцца адным з найважнейшых сродкаў фарміравання дзяржаўнасці. Сучасная беларуская публіцыстыка ва ўсёй разнастайнасці сваіх форм выконвае кансалідуючую функцыю, вырашае палітычныя, эканамічныя і сацыяльна-культурныя задачы ў адпаведнасці з запытам грамадства і дзяржавы. Доказам гэтага з'яўляюцца заканадаўчыя акты, якія рэгулююць механізм непасрэднага ўзаемадзеяння сродкаў масавай камунікацыі і дзяржавы ў справе забеспячэння высокіх стандартаў жыцця. Так, Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 630 ад 5 снежня 1997 г. «Аб рэагаванні службовых асоб на крытычныя выступленні ў дзяржаўных сродках масавай інфармацыі» (з 3 снежня 2024 г. у выніку актуалізацыі з улікам сучасных тэндэнцый развіцця інфармацыйнай сферы выкладаецца ў новай рэдакцыі) вызначае парадак сумесных дзеянняў рэдакцый дзяржаўных СМІ і органаў улады, накіраваных на выяўленне і ліквідаванне праблем, аб якіх паведамляецца ў грамадска значнай інфармацыі. Прадугледжаныя Указам нормы дазваляюць «узмацніць узаемадзеянне дзяржорганаў, СМІ і экспертнай супольнасці па інфармаванні насельніцтва, у тым ліку аб праблемных пытаннях і шляхах іх вырашэння» [1].

Бібліяграфічныя спасылкі

1. Об изменении Указа Президента Республики Беларусь (корректируется Указ № 630 от 5 декабря 1997 г.) Указ № 452 от 3 декабря 2024 г. URL: https://president.gov.by/ru/documents/ukaz-no-452-ot-3-dekabra-2024-g (дата звароту: 23.06.2025).

ЯЗЫКОВОЙ ПОРТРЕТ ЛИЧНОСТИ ВОЕННОГО КОРРЕСПОНДЕНТА

Е. В. Мартыненко[1)], Д. А. Кургузов[2)]

[1)]Российский университет дружбы народов им. П. Лумумбы, ул. Миклухо-Маклая, 10/2, 117198, г. Москва, Россия, martynenko_ev@pfur.ru,

[2)]Российский университет дружбы народов им. П. Лумумбы, ул. Миклухо-Маклая, 10/2, 117198, г. Москва, Россия, 1142240002@pfur.ru

Цель исследования – рассмотреть ключевые инструменты, используемые при создании языкового портрета личности военного корреспондента. Авторы подчеркивают, что фундаментом языкового портрета военкора являются лаконичные и выразительные высказывания, нацеленные не только на информирование о событиях, но и на пробуждение у читателя чувств, сопереживания, сопричастности; подчеркивается влияние специфики военной журналистики на манеру речи корреспондента.

Ключевые слова: военный корреспондент; языковой портрет; коммуникация; медиадискурс; аудитория.

МОЎНЫ ПАРТРЭТ АСОБЫ ВАЕННАГА КАРЭСПАНДЭНТА

А. В. Мартыненка[1)], Д. А. Кургузаў[2)]

[1)]Расійскі ўніверсітэт дружбы народаў імя П. Лумумбы, вул. Міклуха-Маклая, д. 10. корп. 2, 117198, г. Масква, Расія, martynenko_ev@pfur.ru,

[2)]Расійскі ўніверсітэт дружбы народаў імя П. Лумумбы, вул. Міклуха-Маклая, д. 10. корп. 2, 117198, г. Масква, Расія, 1142240002@pfur.ru

Мэта даследавання – разгледзець ключавыя інструменты, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні моўнага партрэта асобы ваеннага карэспандэнта. Аўтары падкрэсліваюць, што падмуркам моўнага партрэта ваен-

кора з'яўляюцца лаканічныя і выразныя выказванні, нацэленыя не толькі на інфармаванне аб падзеях, але і на абуджэнне ў чытача пачуццяў, суперажыванняў, датычнасці; падкрэсліваецца ўплыў спецыфікі ваеннай журналістыкі на манеру прамовы карэспандэнта.

Ключавыя словы: ваенны карэспандэнт; моўны партрэт; камунікацыя; медыядыскурс; аўдыторыя.

Важной вехой современности в языкознании можно назвать повышенное внимание к человеческому фактору в процессе речи. Речь рассматривается не как абстрактное явление, а как продукт деятельности человека, что обуславливает переосмысление абсолютности языковых норм и способов их использования.

Среди авторов, активно занимающихся исследованиями языкового портрета журналиста, необходимо выделить Д. А. Буравчикову, которая в научной работе «Речевой портрет современного журналиста» выделяет различные уровни его анализа. Семантика рассматривается на начальном уровне, что подразумевает изучение владения субъектом обыденной речью. На первом (лингвокогнитивном, тезаурусном) уровне анализируется иерархия ценностей автора текста с описанием обобщенных (теоретических или житейских) понятий, крупных концептов, идей, выразителями которых выступают слова начального уровня, но уже наделенные дескрипторным статусом. Анализ второго, высшего – мотивационного (прагматического) – уровня включает описание целей и мотивации. Стереотипом (ключевой «единицей») на этом уровне служит прецедентный (повторяющийся и общепринятый для конкретной культуры) текст, например, цитата, ставшая крылатым выражением, имя собственное, выполняющее не только функцию обозначения художественного образа, но и связанное с определенным смыслом для адресата [1, с.113–114]. В статье Н. А. Родиной описывается специфика военного социума и области его влияния. Автор подчеркивает влияние жесткой структуры и дисциплины на формирование речевого портрета. Она отмечает значимость общественного мнения и стремление соответствовать общепринятому образу военного [2]. Разумеется, нельзя напрямую переносить результаты исследования языкового портрета военных на военных журналистов, поскольку это совершенно разные сферы деятельности, и представители этих профессий решают различные задачи, даже находясь в зоне боевых действий. Значительное количество иссле-

В статье раскрываются взгляды китайских интеллектуалов 1930-х гг. на феномен популярности звезды немого кинематографа Чарли Чаплина в Китае и во всем мире. Китайские интеллектуалы интерпретировали этот феномен через призму китайских культурных, философских и эстетических ценностей. Для них Чаплин был не просто иностранным актером, а носителем даосского мировоззрения и театральных традиций Китая, что объясняло его гениальность и феноменальную популярность по всему миру. Такая интерпретация стала актом культурного самоутверждения Китая на международной арене.

Ключевые слова: Чарли Чаплин; «The China Critic»; Китай 1930-х.

КІТАЙСКІ ПОГЛЯД НА ЧАРЛІ ЧАПЛІНА (ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЧАСОПІСА «THE CHINA CRITIC»)

Д. М. Гіргель

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
dhirhel@gmail.com

У артыкуле раскрываюцца погляды кітайскіх інтэлектуалаў 1930-х гг. на феномен папулярнасці зоркі нямога кінематографа Чарлі Чапліна ў Кітаі і ва ўсім свеце. Кітайскія інтэлектуалы інтэрпрэтавалі гэты феномен праз прызму кітайскіх культурных, філасофскіх і эстэтычных каштоўнасцяў. Для іх Чаплін быў не проста замежным акцёрам, а носьбітам даоскага светапогляду і тэатральных традыцый Кітая, што тлумачыла яго геніяльнасць і фенаменальную папулярнасць па ўсім свеце. Такая інтэрпрэтацыя стала актам культурнага самасцвярджэння Кітая на міжнароднай арэне.

Ключавыя словы: Чарлі Чаплін; «The China Critic»; Кітай 1930-х.

В XX веке Чарли Чаплин (1889–1977) был феноменально популярен во всем мире. «Когда думаешь о Чаплине, то прежде всего хочется вникнуть в тот странный строй мышления, который видит явления таким странным образом и отвечает на них образами такой странности. […] Вот что волнует, вот что интересует, вот что хочется разгадать: чьими глазами глядит на жизнь Чарли Чаплин?» – писал С. Эйзенштейн в статье «Charlie the Kid» (1943–1945 гг., впервые опубликована с сокращениями в 1945 г.) [1, с. 494–495]. За несколько лет до статьи С. Эйзенштейна китайские интеллектуалы искали объяснение феноменальной популярности Чаплина во всем мире и особенно в Китае. Известно, что только в период с 1919 по 1924 г. в Китае было показано 29 фильмов Чаплина. Его мастерство пришлось по душе китайцам, и молодая китайская киноиндустрия предлагала фильмы в похожей стилистике. Настолько, что студия Mingxing в 1922 г. сняла фильм «滑稽大王游沪记» (Huájī dàwáng yóu hù jì), также известный как «Король комедии посещает Шанхай» («The King of Comedy Visits China»), рассказывающий о вымышленном визите Чаплина в город. Главную роль в фильме сыграл двойник Чаплина – Ричард Белл (1889–1965). Чаплин посетил Китай в 1936 г. В Китае он пробыл всего один день, но его визит вызвал сенсацию, и новости о нем заполнили заголовки по всей стране.

В 1932 г. в китайском англоязычном журнале «The China Critic» в эссе «Чаплин» философ и писатель Т. К. Чуань (全增嘏, 1903–1984) объяснил феномен популярности Чаплина. Он поставил перед собой задачу раскрыть «сущность» артистичности Чаплина. Простое объяснение, что Чаплин – превосходный комик, казалось ему недостаточно убедительным, поскольку это именно то, что требовало объяснения. «Мы, которые не слишком высокого роста, должны быть особенно ему благодарны, потому что он дал нам почувствовать себя оправданными и отомщенными» [2, с. 433]. «Мы» – это китайцы, которые узнавали себя в чаплиновском Бродяге. Автор пришел к выводу, что Чаплин «прославил комплекс неполноценности», и именно в этом заключается его истинное величие.

В 1936 г. в журнале «The China Critic» была опубликована статья Яо Синьнуна (姚莘農, также известного как Яо Кэ 姚克, 1905–1991) под названием «Китаец в Чаплине» [3]. Яо Синьнун – первый китайский студент, окончивший Йельскую школу драмы, редактор журнала «T'ien Hsia Monthly», а также известный драматург и сценарист.

Автор отмечал, что Чаплин – самый широко известный и почитаемый иностранный киноактер в Китае, а также единственный, кто с тех пор, как его фильмы дебютировали в стране в 1910-х гг., сохранил свою популярность среди китайской аудитории. Звезды немого кино – Перл Уайт, Лилиан Гиш, Мэри Пикфорд, Гарольд Ллойд – остались в сознании китайского кинозрителя лишь воспоминанием, и их фильмы больше не показывали в кинотеатрах. Однако Чаплин по-прежнему оставался большим фаворитом. Его имя прочно вошло в повседневную речь китайцев.

Автор задавался вопросами: «Почему? В чем секрет его несравненной популярности в Китае?» Похоже, это очередная загадка в длинном списке «китайских головоломок». Автор предположил самый очевидный ответ, что Чаплин – отличный комик. Это, конечно, правда, но не вся правда. То, что принесло Чаплину долгую популярность, гораздо сложнее простого умения вызывать смех. Автор пришел к выводу, что это секрет, но только не для китайцев. Потому что Чаплин – это китаец.

Чаплин – китайский актер. Его искусство на экране – не что иное, как искусство китайского актера на сцене. Все действия китайского актера, даже такие незначительные, как движение руки, не случайны и основаны на стилистических образцах. На китайской сцене люди представлены типами персонажей и классифицируются соответствующим образом. Когда входит злодей, сразу понимаешь, что он злодей. Когда появляется комик, вы без раздумий узнаете его таковым. Каждая роль имеет свою особую манеру речи, действий и прочего, так что вы можете сказать, как она исполняется, даже не глядя на сцену. Зритель пристально смотрит на актера только для того, чтобы увидеть, насколько хорошо он это делает. Когда зритель смотрит фильмы Чаплина, он чувствуете то же самое.

Каждое его движение, настолько стилистически структурировано, что не может быть чьим-либо еще. Он создал и сплел их в одно неповторимое целое и вдохнул в его призрачное существование жизнь настолько трогательно-реальную, что она прокрадывается в сердца зрителей и живет там помимо их самих. Это искусство Чаплина, и оно китайское.

Кроме исполнительского мастерства, Чаплин является китайцем в том смысле, что он даос. Даосское начало отражено в его фильмах, в которых он выступал в роли актера, режиссера и сценариста. Все его фильмы вызывают невероятный смех, но их истории по большей части скорее патетические, чем смешные. Они, как правило, не комичны и не

трагичны. Они показывают лишь краткий, эфемерный, неважный эпизод жизни во сне, затем заканчиваются и исчезают в огромной пустоте времени и пространства. «Огни большого города» (1931) – отличный тому пример.

Человек, которого Чаплин изображает на экране, также является совершенным даосом. Он – вечный бродяга, дитя природы. Он совсем один – бездомный, без родителей, без семьи, без денег. Он никуда не идет, но он везде. Он никто, но он кто угодно. Он не ленив и не прилежен, потому что он ничего не делает. Он одновременно самый скромный и самый гордый из людей. Его могут растоптать ногами и оплевать, или же дать ему состояние и сделать королем. Но его невозможно победить или испортить. Он неизменен, как неизменно Дао, ибо он совершенный даос.

Яо Кэ сравнивал образ Бродяги Чаплина с персонажами китайской литературы. По его мнению, одной из наиболее заметных особенностей китайского романа является искусство выразительной характеристики. Китайские писатели использовали ту же технику при создании своих персонажей, какую применял Чаплин, создавая образ Бродяги.

Яо Кэ утверждал, что все великие художники неизменно являются мастерами стиля в своей области. Кроме того, он был убежден, что все великие мастера стиля – китайцы. Автор допускал, что читатель мог возразить: художник не обязательно должен быть китайцем, чтобы быть мастером стиля. Но Яо Кэ настаивал на том, что величайший стилист из всех – это китаец. Следуя этой логике, он пришел к выводу, что Чаплин как художник – китаец. Почему? Потому что Чаплин – великий стилист, а значит, и он – китаец. Яо Кэ превозносил эту сторону китайской культуры и обращался к читателю: «Хотите верьте, хотите нет, но китайцы все стилизуют. В Китае нет ничего невозможного!» В искусстве стиля Запад уступает Китаю [3, с. 298]. Китаец – величайший стилист. Поэтому понятно, почему Чаплин, как величайший стилист экрана, – китаец.

Но, конечно, нельзя считать, что все китайские актеры являются великими стилистами. Когда Яо Кэ сравнивал Чаплина с китайскими актерами, он имел в виду, что они схожи в техническом плане, в создании стилизованных персонажей. Костюм Бродяги, грим Чаплина и его своеобразные манеры стандартизированы так же, как и различные роли в китайском театре. Однако для Чаплина, как и для великого китайского театрального артиста, стилизованный образ – это пьедестал, на котором он стоит и возвышается. Создание образа – это часть искусства,

связанная с определенным методом, но совершенно отличная от того, что делает его мастером стиля. Потому что стиль – это индивидуальный способ художественного выражения, который характерен только для того, кто придает ему форму. В глазах китайцев Чарли Чаплин – китаец.

Яо Кэ пришел к выводу, что по своей манере исполнения, высочайшему мастерству и жизненной философии Чаплин лучше всего отражает дух китайской культуры. С одной стороны, в статье Яо Кэ можно усмотреть стремление прославить не столько самого Чаплина, сколько китайскую культуру. С другой стороны, вместе с международным признанием Чаплина получало признание и «китайское Я» его гения. Подчеркивая «китайскость» в образе звезды мирового кино, автор возвышал китайскую культуру, поднимая ее до уровня мирового значения.

Яо Кэ раскрыл феноменальную популярность Чарли Чаплина в Китае и его восприятие как культурного и художественного явления, глубоко связанного с китайской традицией и мировоззрением. Чаплин китайцами воспринимался не только как выдающийся комик и мастер киноискусства, но и как носитель даосских ценностей, типичных для китайской культуры. Его образ – это не просто стилизованный персонаж, а воплощение вечных принципов гармонии, простоты и внутренней силы, присущих даосской философии. Китайские интеллектуалы 1930-х годов видели в Чаплине отражение собственных культурных традиций: его движения, манеры и стилистика напоминали китайский театр и литературу, где персонажи четко типизированы и символичны. В этом контексте Чаплин становился не просто иностранным актером, а «китайцем» на экране – носителем тех же ценностей и художественных приемов, что и китайские мастера.

Чаплин – это яркий пример того, как западное искусство может быть интерпретировано через китайскую философию и эстетические ценности. Популярность Чаплина в Китае выразила более глубокий процесс диалога между культурами: он стал мостом между Западом и Востоком, объединив их через общие идеи гуманизма, простоты и внутренней гармонии.

Библиографические ссылки

1. *Эйзенштейн С. М.* Charlie the Kid // Избранные произведения : В 6 т. М .: Искусство, 1964. С. 494–521.
2. *T. K. C.* Chaplin // The China Critic. 1932. 05 May. P. 433.
3. *Yao Hsin-nung.* The Chinese in Chaplin // The China Critic. 1936. 26 March. P. 296–298.

СТРАТЕГИИ ПОПУЛЯРИЗАЦИИ ХУДОЖЕСТВЕННОГО ТВОРЧЕСТВА В СОВРЕМЕННЫХ БЕЛОРУССКИХ И КИТАЙСКИХ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННЫХ ЖУРНАЛАХ ОБ ИСКУССТВЕ

Е Сысы

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
yesisi525977@gmail.com

Научный руководитель – Е. В. Локтевич,
кандидат филологических наук, доцент

В статье осмысляется специфика популяризации художественного творчества средствами специализированных средств массовой информации. На материале белорусских и китайских журналов об искусстве рассматриваются наиболее успешные и актуальные стратегии популяризации творческой деятельности человека. Осуществляется сравнительно-сопоставительный анализ стратегических подходов к продвижению разных видов искусства в специализированных изданиях.

Ключевые слова: специализированные средства массовой информации; культура; искусство; художественное творчество; стратегия; популяризация.

СТРАТЭГІІ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ МАСТАЦКАЙ ТВОРЧАСЦІ Ў СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ І КІТАЙСКІХ СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ ЧАСОПІСАХ ПРА МАСТАЦТВА

Е Сысы

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
yesisi525977@gmail.com

Навуковы кіраўнік – К. В. Лакцевіч,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

У артыкуле асэнсоўваецца спецыфіка папулярызацыі мастацкай творчасці сродкамі спецыялізаваных сродкаў масавай інфармацыі. На матэрыяле беларускіх і кітайскіх часопісаў пра мастацтва разглядаюцца больш паспяховыя і актуальныя стратэгіі папулярызацыі творчай дзейнасці чалавека. Здзяйсняецца параўнальна-супастаўляльны аналіз стратэгічных падыходаў да прасоўвання розных відаў мастацтва ў спецыялізаваных выданнях.

Ключавыя словы: спецыялізаваныя сродкі масавай інфармацыі; культура; мастацтва; мастацкая творчасць; стратэгія; папулярызацыя.

В сфере современной медиакультуры наблюдается высокий уровень конкурентной борьбы за внимание реципиента, что требует от белорусских и китайских специализированных СМИ об искусстве существенного обновления стратегий популяризации художественного творчества. Еще совсем недавно жанровые формы и форматы (ре)презентации искусства функционировали преимущественно в пределах профессионального сообщества (собственно творческого, искусствоведческого, журналистского), однако сегодня творческая деятельность человека все чаще синтезируется с направлениями массовой культуры. Обозначенная тенденция имеет ряд очевидных преимуществ: расширение целевой аудитории, сохранение в памяти культуры разнообразия типов творческого мышления, укрепление межкультурного диалога в зоне созидательного бытия. Актуальность представленного исследования обусловлена необходимостью осмысления стратегий, обеспечивающих популяризацию художественного творчества в современных белорусских и китайских специализированных СМИ об искусстве.

Вопросы стратегического планирования в сфере популяризации и продвижения искусства поднимаются в исследованиях многих современных белорусских и китайских ученых. Так, позиционирование посредством промоакций как эффективный способ популяризации деятельности драматических театров изучает А. М. Стельмах, акцентируя особое внимание на деятельности Национального академического театра имени Янки Купалы [1]. В работах Н. В. Саяновой на примере медиаактивности ведущих национальных театров Беларуси анализируется необходимость системного стратегирования в сфере продвижения театрального контента на современных медиаплатформах, среди которых в качестве наиболее востребованной в силу широкого спектра форматов, активной визуализации и потенциала коротких видео автор называет

Instagram [2]. Вопросы использования новых медиа в продвижении традиционного театра поднимаются в научных статьях Хуэйжун Ай, который подчеркивает, что большое значение для сохранения и популяризации традиционной китайской культуры имеют «оцифровка культурных продуктов и создание национальной базы больших данных [3]. Юйси Му рассматривает медиаобраз Китая в русскоязычных текстах блогов о китайской живописи, опере, художественной вышивке и каллиграфии и демонстрирует разнообразие «языковых средств описания китайской оперы, живописи, художественной вышивки и каллиграфии» [4]. Впечатления, представленные в публикациях блогеров, формируют, по мнению исследователя, значительную часть медиаобраза Китая, «связанного с культурой, с его важнейшей составляющей – искусством» [4].

Среди ключевых стратегий популяризации творчества можно выделить интерактивную проектную деятельность, визуализацию, креолизацию, персонализацию историй о художниках, синтез искусства и актуальных социокультурных маркеров (тем, мотивов). Журналисты, критики, специалисты в области рекламы и связей с общественностью сегодня активно используют в своих материалах цифровые стратегии – реализуют контент об искусстве посредством SMM (блогинг, стриминг и подкастинг), веб-сайтов / порталов / лендинга, онлайн-мероприятий, креативных и маркетинговых интернет-коллабораций. Отметим, что максимально продуктивной будет комплексная модель популяризации, которая позволит эффективно (ре)транслировать художественные образы и смыслы широкой аудитории, вовлечь в диалог об искусстве профессионалов и неподготовленного реципиента.

При изучении способов популяризации современного искусства на примере реализации интерактивного проекта «Арт-поход» Н. В. Сысоева выделяет «выставки, инсталляции, творческие мастерские, декламацию современного стихотворения, игру» [5], и эти форматы в дальнейшем будут репрезентироваться в разных специализированных изданиях уже средствами журналистики и литературно-художественной критики. Современные медиа, – считает И. И. Югай, почти всегда «воспринимаются как автором, так и зрителем как новация – техническая и художественная, поскольку стимулирует поиск средств авторского выражения, синтеза искусства, способа обращения к зрителю» [6]. Цифровое медиаискусство, полагает Хань Цзыи, «помогает обогатить наше художественное творческое мышление, расширить наше художественное творческое пространство и вдохновить на создание новых ше-

девров искусства» [7]. Очевидно, что все перечисленные классические и инновационные стратегии могут стать методологическим основанием для популяризации разных видов творческой деятельности средствами современных специализированных СМИ об искусстве.

В журналистике понятие стратегии предполагает, по мнению А. А. Тертычного, «связь настоящего и желаемого будущего, представленную в виде определенной программы деятельности» [8], что можно декодировать, как осознанно выстроенную систему приемов, форматов и каналов коммуникации, направленную на достижение конкретных задач, в частности, на донесение определенного содержания до аудитории максимально эффективным способом. В случае популяризации искусства средствами специализированных СМИ такой подход предполагает выбор тематики контента, его визуального сопровождения и платформ для распространения. Заметим, что эти стратегии во многом пересекаются с PR-технологиями и рекламными методиками, поскольку также стремятся создать привлекательный образ художника, художественного события или явления, вызвать интерес, доверие и эмоциональную вовлеченность публики.

Белорусский журнал «Мастацтва» использует в своем стратегическом арсенале жанровые ориентиры: интервью, статья, рецензия, очерк и персональная история, усиление вербального текста визуальным рядом – фотографиями работ, фрагментов творческого процесса, авторов творческих проектов, – что приближает искусство к читателю и делает его более понятным. Так, в обзорной статье «Вятры-павевы “Трамантаны”» [9, с. 24–27] Надежды Бунцевич повествование ведется о проекте, который всего за несколько лет своего существования стал настоящим брендом белорусской камерной музыки. Материал содержит визуальный ряд, отличающийся тщательно продуманной структурой и последовательным раскрытием темы. Каждое изображение органично дополняет текст, благодаря чему создается целостное восприятие контента и усиливается эмоциональная тональность повествования. Такой подход позволяет читателю погрузиться в тему, приблизиться к процессу создания фотографии и художественного высказывания как журналистских приемов. Особенно ценно с точки зрения популяризации искусства наличие в публикации фрагментов творческого процесса – так рецепция материала становится более «проникновенной», благодаря чему формируется интерес к искусству.

Китайский журнал «Искусство и дизайн» также обращается к потенциалу журналистских жанров и визуализации контента, к рекламным приемам и PR-стратегиям. Очерк «Дзен неспешного дизайна» («慢设计的禅者») [10, с. 104–107] Лян Ли демонстрирует не только готовые произведения известного бельгийского дизайнера Ян-Ян ван Эссе, но и его рабочего пространства – мастерской и творческого стола, и это придает публикации некоторую интимность, доверительный фокус. Такой подход позволяет читателю получить более полное представление о процессе создания произведения искусства и увидеть ту обстановку, в которой рождаются идеи, а также понять, каким образом формируется индивидуально-авторский стиль творца. Безусловно, демонстрация «закулисья» творческого процесса – успешная стратегия популяризации искусства и средство привлечения внимания новой аудитории.

«Мастацтва» демонстрирует тенденцию к формированию «живого», биографически маркированного образа художника через очерк, визуальный портрет, так как реалистическая связанность образа автора-творца и его творения очень важна для восприятия любого вида искусства. Журнал ориентирует читателя на цифровые форматы получения дополнительной информации, как, например, в развернутой театральной рецензии (фестивальном обзоре) «Тэатры усіх краін, кантактуйце!» [11, с. 35–39] Надежды Бунцевич, в котором автор уделяет внимание не только описанию самого мероприятия, следуя традиционной журналистской форме, но и расширяет информационное поле за счет включения цифрового компонента – ссылку на один из самых масштабных в Беларуси театральных форумов М.@rt.кантакт: «Прэм'ернай "Жаніцьбай" адразу быў заяўлены гогалеўскі лейтматыў сёлетняга форуму: "М.@rt.кантакт" утрымліваў ажно чатыры спектаклі і адзін эскіз, пастаўленыя па творах гэтага рускага і ўкраінскага класіка» [11, с. 36]. Автор упоминает и анализирует разные жанры представленных на форуме работ (драма, комедия, трагедия, трагикомедия, мелодрама, мюзикл, моноспектакль, постмодернистские эскизы, документальная пьеса (мокьюментари), психологический театр, site-specific и др.). Н. Бунцевич не просто сообщает факты, а дает компетентную оценку, интерпретирует, сравнивает постановки между собой и с предыдущими работами, указывает на успешные моменты и недостатки, размышляет о перспективности тех или иных подходов: «Вылучэнне пераможцаў на падобных форумах – тэта яшчэ і вызначэнне найбольш перспектыўных шляхоў...», «У параўнанні з такім вельмі сціплым увасабленнем...», «На

жаль, спектакль ішоў без перакладу...», «Міжволі ўзнікала пытанне...», «Сталічны спектакль... працягвае характэрнае для рэжысёра...», «Затое нішто не перашкаджала ўслухвацца...» [11, с. 35–39]. Такая стратегия позволяет читателю не просто ознакомиться с основными фактами, но и при желании углубиться в тему, получить доступ к дополнительным материалам, фотографиям или видеозаписям через дополнительный цифровой ресурс.

В китайских специализированных СМИ также эффективна мультимедийная стратегия – издания внедряют цифровые форматы, например, QR-коды к статьям, ведущие на видеоматериалы, галереи работ. Например, в подготовленном Чен Е очерке «Во имя классицизма – художественные изыскания Пан Маокуна» («以“古典”之名的艺术探索») [12, с. 216–221] на фото картины «Новое меню Эммауса» размещен QR-код, отсканировав который, читатель может перейти к ее цифровой версии и детально рассмотреть произведение искусства. Стратегия позволяет не просто читать о художественном произведении, но фактически «взаимодействовать» с ним на эмотивном и креативном уровнях. Выявленный подход превращает журнал из обычного источника информации или оценочного суждения в полноценную цифровую платформу для культурного и визуального опыта разных реципиентных групп.

Современные стратегии популяризации искусства все более активно опираются на синтез традиционных (жанровые, стилистические и языковые средства, рекламные «вставки») и цифровых (онлайн-трансляции, QR-код, AR-/VR-контент, SMM-технологии) форматов, что позволяет изданиям быть более интерактивными, психологически близкими, креативно «контактными». Перспективным видится дальнейшее осмысление обозначенной проблемы в сфере специализированного теле-, радио- интернет-контента белорусских и китайских СМИ, реализующих стратегии популяризации искусства.

Библиографические ссылки

1. *Стельмах А. М.* Популяризация театрального искусства средствами промоакций. URL: http://repository.buk.by/bitstream/handle/123456789/27128/populyarizaciya_teatralnogo_iskusstva_7.pdf?sequence=1&isAllowed=y (дата обращения: 22.05.2025).
2. *Саянова Н. В.* Популяризация белорусского театрального искусства: продвижение в социальных медиа. URL: https://elib.bsu.by/bitstream/123456789/321836/1/254-258.pdf (дата обращения: 19.05.2025).

3. *Ай Х.* Роль новых медиа в продвижении китайского оперного искусства. URL: https://doi.org/10.25205/1818-7919-2025-24-4-21-29 (дата обращения: 28.05.2025).
4. *Му Ю.* Тексты блогов об искусстве как источник изучения медиаобразования Китая. URL: https://journals.tsu.ru/uploads/import/2200/files/475-035.pdf (дата обращения: 11.05.2025).
5. *Сысова Н. В.* Способы популяризации современного искусства при реализации интерактивного проекта «ART-Поход». URL: https://journals.uspu.ru/attachments/article/1367/Sysoeva.pdf (дата обращения: 22.05.2025).
6. *Югай И. И.* Роль медиа в развитии художественных форм и языка современного искусства. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/rol-media-v-razvitii-hudozhestvennyh-form-i-yazyka-sovremennogo-iskusstva/viewer (дата обращения: 20.05.2025).
7. *Хань Ц.* Продвижение современного искусства в цифровых медиа. URL: https://ojs.age-info.com/index.php/ai/article/view/252/257 (дата обращения: 17.05.2025).
8. *Тертычный А. А.* Коммуникативная стратегия и журналистский текст. URL: https://cyberleninka.ru/article/n/kommunikativnye-strategii-i-zhurnalistskiy-tekst/viewer (дата обращения: 27.05.2025).
9. *Бунцэвіч Н.* Вятры-павевы «Трамантаны» // Мастацтва. 2024. № 5. С. 24–27
10. *Лян Л.* Дзен неспешного дизайна // Искусство и дизайн. 2024. № 11. С. 104–107.
11. *Бунцэвіч Н.* Тэатры ўсіх краін, кантактуйце! // Мастацтва. 2024. № 4. С. 35–39.
12. *Чен Е.* Во имя классицизма – художественные изыскания Пан Маокуна // Искусство и дизайн. 2025. № 01–02. С. 216–221.

ГІСТАРЫЧНЫЯ СТАРОНКІ Ў КАШТОЎНАСНАЙ ПАРАДЫГМЕ СУЧАСНЫХ БЕЛАРУСКІХ РАЁННЫХ ГАЗЕТ

І. А. Івашка

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
ivashkoirina9@gmail.com

Навуковы кіраўнік – К. В. Лакцевіч,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт

У артыкуле разгледжаны асаблівасці афармлення гістарычных старонак у беларускім мясцовым друку. Зроблена выснова, што функцыянаванне спецыяльных палос у раённых газетах Беларусі абумоўлена дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкай, скіраванай на захоўванне калектыўнай памяці пра ВАВ, дакументалізацыяй сведчанняў пра ваенныя падзеі, а таксама мемарыялізацыяй памяці пра ўдзельнікаў ВАВ і пацярпелых ад яе наступстваў.

Ключавыя словы: гістарычныя старонкі; раённыя выданні; каштоўнасная парадыгма; гістарычная памяць.

ИСТОРИЧЕСКИЕ СТРАНИЦЫ В ЦЕННОСТНОЙ ПАРАДИГМЕ СОВРЕМЕННЫХ БЕЛОРУССКИХ РАЙОННЫХ ГАЗЕТ

И. О. Ивашко

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
ivashkoirina9@gmail.com

Научный руководитель – Е. В. Локтевич,
кандидат филологических наук, доцент

В статье рассмотрены особенности оформления исторических страниц в белорусской местной печати. Сделан вывод, что функционирование специальных полос в районных газетах Беларуси обусловлено государственной информационной политикой, направленной на хранение коллектив-

ной памяти о ВОВ, документализацией свидетельств о военных событиях, а также мемориализацией памяти об участниках ВОВ и пострадавших от нее последствий.

Ключевые слова: исторические страницы; районные издания; ценностная парадигма; историческая память.

Большасць гістарычных палос сучасных беларускіх мясцовых выданняў прысвечана падзеям Вялікай Айчынай вайны. Падобны кантэнт прадстаўлены «Да 80-годдзя Перамогі», «Маленькія сведкі вялікай вайны», «Расстраляныя лёсы», «Память бессмертна», «Шагая по улице героя» і г. д. Некаторыя з іх функцыянуюць не толькі як пастаянныя палосы ці палосы, прысвечаныя святочнай даце (дню Перамогі, гадавіне са дня вызвалення Беларусі, дзень памяці Хатыні, Міжнародны дзень памяці вязняў канцлагероў і пад.), але і як спецыяльныя праекты рэдакцый. Такая заканамернасць бачыцца невыпадковай, паколькі ВАВ, не выключаючы павышанай увагі да іншых эпізодаў шматвекавой гісторыі [1], «з'яўляецца адной з ключавых падзей гісторыі Беларусі і важным кампанентам палітыкі нацыянальнай памяці» [2, с. 69]. Да таго ж павышаны інтарэс медыядаследчыкаў да дыскурса гістарычнай памяці, на думку К. Ю. Алёшынай, М. Я. Блоха, Т. А. Разуваевай і А. В. Камплеева, звязаны са змяненнем вывучэння суадносін гісторыі і памяці, а таксама павелічэннем інтарэсу грамадства да падзей мінулага [3, с. 40].

Асаблівасці функцыянавання палос гістарычнай тэматыкі разгледзім на прыкладзе чатырох раённых газет. Так, журналісты **«Навін Старадарожчыны»** І. Кандаўрава і В. Патоцкая апелююць да падобнага кантэнту на трох спецыялізаваных палосах – *«Память», «80-летию Великой Победы посвящается» і «Улица имени героя»*. Цэнтральнымі асобамі іх матэрыялаў з'яўляюцца ўдзельнікі баявых дзеянняў, партызаны, дзеці вайны, а таксама родныя людзей, якія перажылі Вялікую айчынную вайну. Цэласную карціну апісваемых падзей чытачу дапамагаюць сфарміраваць таксама архіўныя фотаздымкі, ваенная хроніка і вытрымка з узнагародных папер ці дакументаў. Пры гэтым кожны матэрыял займае асобную паласу ці разварот.

Гістарычныя старонкі выдання, дзякуючы аўтарскай інтэрпрэтацыі матэрыялу, набылі шэраг асаблівасцей:

1) раскрыццё героя публікацыі ажыццяўляецца праз храналогію «мінулае – сучаснасць», а таксама вобразы/аповеды членаў сям'і;

2) ваенны лёс раёна апісваецца ў кантэксце запуску мясцовых ініцыятыў, накіраваных на захаванне гістарычнай памяці: *«Это было одно из тех хороших, настоящих дел, которые однажды начинаются с обычной публикации в районной газете. В нашем случае – с заметки о том, что администрация района запланировала реконструкцию мемориального комплекса»* (материал «В списках значатся», 17.05.2025 г.);

3) гісторыя раёна раскрываецца праз прыналежнасць да Старых Дарог герояў Вялікай Айчыннай вайны, у гонар якіх названы вуліцы райцэнтра: *«Эта крепкая крестьянская семья жила размеренной жизнью, разрастаясь год от года. Но война сумела вырубить ее едва ли не под корень: на фронте сложили головы шесть из восьми сыновей Аксеневичей»* («Сыновья уходят в бой», 03.05.2025 г.);

4) стварэнне эфекта прысутнасці пасродкам ўжывання ў публікацыях успамінаў сведкаў ці урыўкаў з мемуараў: *«Над полями и лугами, лесами и болотами прокатилось громкое эхо. Недаром мы назвали операцию "Эхо на Полесье". Слушайте, фашисты, его раскаты!»* («Этот металл я ношу в себе до сих пор», 10.05.2025 г.); *«Иной раз нескольких минут хватало для того, чтобы поседели виски, сердце окаменело от утраты дорогого человека и с губ невольно слетали слова: "Боже, спаси и сохрани…"»* («Судьба разведчика», 10.05.2025 г.).

У вілейскім **«Шляху Перамогі»** выходзяць палосы *«80 лет Победы/ 80 год вызвалення Беларусі»*. Як правіла, старонкі змяшчаюць некалькі матэрыялаў, аб'яднаных тэматыкай Вялікай Айчыннай вайны. Жанравая палітра спецыяльных палос аб'ядноўвае кароткія заметкі пра ветэранаў («Дорогое имя», 08.05.2025 г.), справаздачы («Забота о ветеранах – наш приоритет», 08.05.2025 г.), успаміны дзяцей вайны («Дзяцінства, апаленае вайной», 09.04.2025 г.; «Вместе с дымом летели и клочья одежды», 29.04.2025 г.). Да сакавіка 2025 года выданне выпускала таксама гістарычную старонку *«80 мірных гадоў»*, прысвечаную аповедам пра мінулае спаленых вёсак Вілейскага раёна («Любчанская трагедыя: як гэта было»22.03.2025 г.; «Сцёрлі з твару зямлі, але не сцёрлі з памяці», 26.04.2025 г.). Адметна, што значную долю кантэнту разгледжаных палос складаюць заметкі пра мерапрыемствы і праекты, прысвечаныя помным датам, звязаных з ВАВ («День память», 05.04.2025 г.; «В память о каждом третьем», 12.04.2025 г. і інш.).

Валожынская **«Працоўная слава»** спецыялізаваны гістарычны кантэнт змяшчае ў *праекце «Они идут к нам как Герои…»* (рубрыка «Векапомнае»). Паводле пазіцыянавання рэдакцыі, такія старонкі

расказваюць чытачам «аб земляках, якія жылі ў ваенныя і пасляваенныя гады». У цэнтры публікацый аказваюцца аповеды нашчадкаў ветэранаў («Горжусь быть правнуком Победы», 18.04.2025 г.; «Суждено быть живым!», 16.05.2025 г.) ці людзей, родных якіх вывозілі на прымусовую працу («Недетские картины памяти», 03.05.2025 г.; «Мучительное путешествие», 10.05.2025 г.), вершы («Волнительно! Торжественно! Незабываемо!», 16.05.2025 г.), радзей – заметкі пра афіцыйныя сустрэчы з дзецьмі вайны і былымі вязнямі канцлагероў («Делегация благодарности», 10.05.2025 г.).

У большасці буйных публікацый І. Далідовіч ўспаміны з'яўляюцца цэнтральнымі элементамі гісторый: *«Очнулся только тогда, когда хрупкая санитарочка перемещала небольшими рывками его израненного, что-то шептала и закрывала рану бинтами <…>. Навсегда отец запомнил голос и глаза своей спасительницы»* («Суждено быть живым!», 16.05.2025 г.); *«Состав буквально разорвало на две части, почти сразу после высадки. Тогда впервые охватил всех страх щемящий и невыносимый»* («Цена Победы», 11.04.2025 г.). Акрамя таго, аповеды дапаўняюцца здымкамі відавочцаў падзей, а таксама фатаграфіямі дакументаў і месц Германіі, дзе ў ваенны перыяд працавалі героі матэрыялаў (дэпо Кёльна, сядзіба Мюнстэра і інш.).

У **«Нашым часе»** (Ельск) гістарычныя старонкі функцыянуюць у межах *праекта «Імя ў гісторыі»*, а таксама базуюцца на матэрыяле публікацый выдання мінулых гадоў (палосы «Праз прызму часу» і «Маршрутамі памяці»). Газета звяртаецца да матэрыялаў як без інфармацыйнай нагод і стрыжнявых герояў, так і да публікацый, якія ў тэксце маюць абгрунтаванне: *«Вспоминают всех погибших в той страшной войне, говорят об их судьбах, а имени моего отца нигде не указано на памятнике, к сожалению. Пока я жива, хочу восстановить справедливость»* («В списках не значится…», 24.08.2024 г.). Так, у выданні выходзяць праблемныя матэрыялы («В списках не значится…», 24.08.2024 г.); тэксты, якія расказваюць гісторыю помнікаў і даюць кароткія звесткі пра пахаваных у брацкіх магілах («Стоит у дороги, голову склонив, солдат», 01.02.2025 г.; «На 137-й высоте», 11.01.2025 г.); знаёмяць з бібліяграфічнымі звесткамі відавочцаў трагедый спаленых вёсак («Заболотье – вечная боль и скорбь», 11.01.2025 г.) ці асоб, імёнамі якіх названы вуліцы Ельска («Застенчивый любимец женщин», 01.02.2025 г.). Асаблівасцю аўтарскіх паведамленняў з'яўляецца падыход, пры якім крыніцамі інфармацыі журналістаў Г. Булаўка, Т. Петрухно, Ж. Найман, Я. Івановай выступаюць не толькі

размовы з героямі матэрыялаў, але і пісьмовыя сведчанні – выпіскі з дакументаў, лісты з фронта («Фронтовые треугольники – это святыня...», 11.02.2025 г.).

Такім чынам, функцыянаванне гістарычных старонак ў раённых выданнях Беларусі абгрунтавана шэрагам прычын: ажыццяўленнем дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, скіраванай на захоўванне калектыўнай памяці пра ВАВ, недапушчэнне рэабілітацыі нацызму і фальсіфікацыі гісторыі; дакументалізацыю сведчанняў пра ваенныя падзеі ў розных рэгіёнах краіны. Разам з тым публікацыі ў мясцовым друку мемарыялізуюць памяць пра беларусаў, якія сталі ўдзельнікамі ВАВ ці пацярпелі ад яе наступстваў. Пра гэта сведчыць як агульны тон гістарычных палос, так і асобныя публікацыі: *«Пока я жива, хочу, чтобы имя моего отца не было забыто. <…> Хочу, чтобы фамилия Трошко Антона Алксеевича не канула в лету»* (НГ, «В списке не значится...», 24.08.2024 г.); *«Знаю, что у миллионов семей война тое забрала родтвенников. лавное, что мы можем сделать в их память <…> никогда не забывать их имена»* (НГ, «Фронтовые треугольники – это святыня...», 11.02.2025 г.); *«Я – правнук ветерана Великой Отечественной войны Михаила Ивановича Баталенка. Мне очень хочется, чтобы о его подвиге узнало как можно больше людей»* (ПС, «Горжусь быть правнуком Победы!», 18.04.2025 г.) і пад. А паколькі аснову гістарычнай памяці чалавека стварае камунікацыйнае і інфармацыйнае асяроддзе, дзе ён знаходзіцца, мясцовыя газеты становяцца крыніцамі ўнікальнай інфармацыі, што дазваляюць пераносіць вопыт мінулага ў сучаснасць для фарміравання маральнага, каштоўнасна-арыентуючага падмурка, які фарміруе калектыўную памяць і свядомасць народа.

Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Валаханович И.* Год исторической памяти в контексте трендов исторической политики уходящего 2022 года и наступающего 2023 года. URL: https://socio.bisr.by/aktualnye-aspekty-v-istoricheskoj-pamjati-belorusov (дата обращения: 15.05.2025).
2. *Ковба Д. М.*, *Грибовод Е. Г.* Особенности формирования и реализации политики памяти о Великой Отечественной войне на постсоветском пространстве // Дискурс-Пи. 2020. № 2(39). С. 59–77.
3. Глобальный конфликт прошлого в современном медиапространстве: историческая память в дискурсивном ракурсе / Алёшина Е. Ю. [и др.] // Galactica Media: Journal of Media Studies. 2021. № 4. С. 17–50.

СТАТУС ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАГА ЧАСОПІСА ЯК КУЛЬТУРНАЙ З'ЯВЫ

А. М. Кавалеўскі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
rybaart@yahoo.com

Даследуецца сутнасць культурнага значэння сучасных літаратурна-мастацкіх часопісаў, іх поліфункцыянальная прырода, выяўляецца іх месца ў сістэме нацыянальных СМІ.

Ключавыя словы: літаратурна-мастацкі часопіс; сродкі масавай інфармацыі; літаратурная прастора; грамадскі кантэкст; культурны феномен; культурныя каштоўнасці.

СТАТУС ЛИТЕРАТУРНО-ХУДОЖЕСТВЕННОГО ЖУРНАЛА КАК КУЛЬТУРНОГО ЯВЛЕНИЯ

А. Н. Ковалевский

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
rybaart@yahoo.com

Исследуется суть культурного значения современных литературно-художественных журналов, их полифункциональная природа, выявляется их место в системе национальных СМИ.

Ключевые слова: литературно-художественный журнал; средства массовой информации; литературное пространство; общественный контекст; культурный феномен; культурные ценности.

Асэнсаванне сутнасці і спецыфікі беларускага літаратурна-мастацкага часопіса як унікальнай, адзінай ў сваім родзе культурнай з'явы – у рамках тэорыі культуры – уяўляецца актуальнай у сувязі з тым, што сацыяльная адказнасць сродкаў масавай інфармацыі і кнігавыдання ва ўмовах глабальнай трансфармацыі сацыяльнай асяроддзя з'яўляецца адной з актуальных праблем навуковай рэфлексіі. Падзеі апошняга часу пацвердзілі, што эканамічная і сацыяльная дыферэнцыяцыя беларускага грамадства, дэвальвацыя духоўных каштоўнасцей, размытасць

каштоўнасных арыенціраў і грамадскіх ідэалаў, развянчання традыцыйных культурных каштоўнасцей аказалі негатыўны ўплыў на грамадскую свядомасць, на стан культуры грамадства ў цэлым. У прыватнасці, практыка выяўляе наяўнасць істотнага разрыву паміж патэнцыйнымі магчымасцямі літаратурна-мастацкіх часопісаў як інструмента ажыццяўлення дзяржаўнай культурнай палітыкі, трансляцыі сацыяльнага вопыту, механізму, які спрыяе фармаванню грамадскай думкі, выбудоўванню сацыяльнай адэкватнасці і ідэнтычнасці асобы, і праблемным становішчам дадзенага сегмента часопіснай перыёдыкі на сучасным этапе.

Змены ў сацыяльнай структуры грамадства, трансфармацыя постсавецкіх нацыянальных сістэм і працэсы глабалізацыі абвастрылі праблему культурнай ідэнтыфікацыі чалавека. Больш за тое, ўзрослая складанасць сацыяльнага жыцця, якая суправаджаецца інтэнсіфікацыяй працэсаў абмену інфармацыяй і павышэннем патрэбы людзей у ёй прывяла да з'яўлення ў сучаснага чалавека розных, часам канфліктуючых ідэнтычнасцей і новых статусаў. Усё гэта запатрабавала ад яго новых камунікатыўных навыкаў, неабходных не толькі для поспеху і функцыянавання, але і проста для выжывання ў сучасным грамадстве. І тут цяжка пераацаніць традыцыйную ролю літаратурна-мастацкіх часопісаў. Асабліва ў рэгіёнах, дзе літаратурна-мастацкі часопіс і сёння працягвае быць цэнтрам міжкультурных зносін людзей, ахоўнікам культурнай прасторы і традыцый. Выкарыстанне літаратурна-мастацкіх часопісаў у якасці сродку фарміравання грамадскай думкі і ўздзеяння на масавую свядомасць, індывідуальную пазітыўную матывацыю можа прадстаўляць не толькі тэарэтычную, але і практычную цікавасць.

«Тоўстыя» літаратурна-мастацкія часопісы ў цяперашні час працягваюць заставацца важнай часткай айчыннай культуры. Разуменне іх ролі ў фарміраванні адзінай культурнай прасторы постсавецкай Беларусі асабліва важна ва ўмовах адкрытага грамадства, ўзрослых магчымасцей для міжкультурных узаемадзеянняў.

Выяўленне асноўных заканамернасцей функцыянавання сістэмы літаратурна-мастацкіх часопісаў у цэлым, яе тыпалагічных характарыстык, вывучэнне структуры канкрэтных выданняў, круга аўтараў і чытацкай аўдыторыі ўяўляецца важным у сучасных сацыяльна-эканамічных умовах. З аднаго боку, «тоўстыя» літаратурна-мастацкія часопісы цяпер з'яўляюцца культурнымі інстытутамі, якія аб'ядноўваюць беларускую інтэлігенцыю, тым самым вызначаючы яе ролю ў культурнай палітыцы, у стварэнні станоўчага іміджу дзяржаўных культурных і сацыяльных

праектаў. З іншага боку, гэта трыбуна, з якой грамадзянская супольнасць выказвае і вызначае каштоўнасныя прыярытэты, вынікі сваіх духоўна-маральных пошукаў, вызначаючы перспектывы развіцця дэмакратычных пераўтварэнняў у краіне, выпрацоўваючы сістэму ўзаемаадносін паміж кіруючай элітай і народам, іншымі словамі – ажыццяўляе працэс сацыякультурнай рэгуляцыі.

Сукупнасць меркаванняў беларускай інтэлігенцыі, іх барацьба, кампрамісы ў канчатковым рахунку выказваюць і ўсе адценні ідэалогіі грамадства. Гэта дазваляе на ўзроўні літаратурна-мастацкіх часопісаў, на ўзроўні літаратурнай і грамадска-палітычнай барацьбы, вызначаць кірунак памкненняў перадавых розумаў Беларусі, а органам улады, адпаведна, іх карэктаваць шляхам стварэння рэдакцый адпаведных ідэйных напрамкаў, іх дзяржаўнага фінансавання, а таксама падтрымкі пэўных творчых калектываў.

Неабходна яшчэ адзначыць, што тоўстыя літаратурна-мастацкія часопісы таксама выконваюць культуразберагальную функцыю: яны захоўваюць жанравую разнастайнасць сучаснай літаратуры, публікуючы цяпер практычна не запатрабаваныя выдавецтвамі і рынкам невялікую аповесць, аповяд, нарыс, вершы, літаратуразнаўчы артыкул, аналітычную рэцэнзію, тым самым ратуючы гэтыя традыцыйныя жанры ад знікнення, што стала б гуманітарнай катастрофай для культуры краіны, якая традыцыйна лічыцца літаратурацэнтрычнай.

Адна з фундаментальных рыс сучаснай навукі і культуры ў цэлым – ярка выяўленая тэндэнцыя да інтэграцыі. У развіцці навук яна прасочваецца ва ўзнікненні новых сінтэтычных дысцыплін. Мы лічым, што толькі ў рамках сінтэтычнага падыходу можна наблізіцца да адэкватнага разумення такога складанага і ў той жа час цэласнага культурнага феномену, як літаратурна-мастацкі часопіс. Даследаванне дадзенай праблемы вырашаецца на стыку культуралогіі, тэорыі і гісторыі культуры, тэорыі журналістыкі, літаратуразнаўства, літаратурнай крытыкі.

Існуе некалькі падыходаў да даследавання «тоўстага» (або энцыклапедычнага) літаратурна-мастацкага часопіса. Сярод іх у першую чаргу назавем культуралагічны.

Культуралагічны падыход да разгляду дадзенай тэмы прадугледжвае даследаванне такой важнай праблемы, як «часопіс і самасвядомасць нацыі». З гэтага пункту гледжання літаратурна-мастацкі часопіс паўстае як спецыфічны сацыяльны інстытут культуры, які валодае самакаштоўнасцю, як даведнік у свеце фундаментальных культурных каштоўнасцей: маральных, духоўных, эстэтычных і інш., які дапамагае

чалавеку вызначыць сваё стаўленне да культурных норм і ідэалам, якія ў рэальным быцці цесна звязаны з каштоўнасцямі культуры. Так, вядомы літаратуразнаўца, крытык, адзін са стваральнікаў «новага свету» У. Я. Лакшын наўпрост супрацьпастаўляе газеты, якія звычайна былі «рупарам ўрада», і часопісы, якія казалі нефармальным голасам грамадства, неслі ў мастацкай і публіцыстычнай форме вялікі аб'ём неафіцыйнай інфармацыі.

Літаратурна-мастацкі часопіс варта разглядаць з аксіялагічнага пункту гледжання як духоўную, маральную і мастацкую каштоўнасць. Дадзены культурны феномен неабходна раскрываць у якасці спецыфічнага сродку развіцця міжасобасных зносін, свабоднай творчай індывідуальнасці, гэтак неабходных для сацыялізацыі і інкультурацыі асобы, здольнай знайсці сваё месца ў свеце, які змяняецца, адэкватна ацэньваць выклікі сучаснасці, прымаць самастойныя рашэнні.

Тыражы вызначаюцца непасрэдна чытацкім попытам, але ў канчатковым рахунку залежаць не толькі ад плацежаздольнасці аўдыторыі, але і ад яе каштоўнасных арыентацый, мастацкіх пераваг, ступені сацыялізацыі і інкультурацыі.

Разглядаючы пытанне аб каштоўнасных перавагах і густах аўдыторыі, мы выяўляем каштоўнасную і агульнакультурную значнасць літаратурна-мастацкага часопіса, арыентаваную на творчае засваенне рэчаіснасці, адэкватных уяўленнях аб дасканаласці, ідэале, пераўтваральным структурную палітру каштоўнасцей у сістэму каштоўнасцей, заснаваную на адрозніванні ацэньваючай і пазнаючай свядомасці.

На сучасным рынку перыёдыкі «тоўстыя» літаратурна-мастацкія і грамадска-палітычныя часопісы лідэрамі, на жаль, не з'яўляюцца. Прайшоў той час і, магчыма, незваротна, калі яны дыктавалі моду цэлай эпосе, фарміруючы эстэтычныя меркаванні і густы, былі, у вядомай ступені, свабоднай трыбунай абмену думкамі, арэнай гарачых спрэчак. Апошнія ажыўленыя палемікі на старонках тоўстых часопісаў адбылася хіба ў перыяд перабудовы ў канцы 1980-х гг.

У апошнія гады, пасля постсавецкіх сацыяльных катаклізмаў у першай палове 1990-х гг., намецілася некаторае ажыўленне ў гэтай сферы, можна нават казаць аб павелічэнні цікавасці да літаратурна-мастацкіх часопісаў, хоць пра сур'ёзны пералом ў свядомасці чытачоў пакуль казаць рана. Важна і тое, што, як і трыццаць гадоў таму, літаратурныя выданні сталі пэўнай духоўнай нішай, стварылі непаўторную аўру і нават, можа быць, справакавалі некаторую сацыяльную і культурную

актыўнасць, усклалі на сябе зборную функцыю, аб'ядноўваючы вакол сябе пісьменнікаў, што, хоць і патроху, культывуе неабходны культурны, літаратурны пласт. Праўда, адбываецца ўсё гэта своеасабліва, з нейкай уласцівай краіне спецыфікай.

Відавочна, існуе патрэба ў сістэмным культуралагічным даследаванні феномену літаратурна-мастацкіх часопісаў, аналізе іх поліфункцыянальнай прыроды, выяўленні іх месца ў сістэме сацыяльных інстытутаў культуры, якія аказваюць уплыў на культурную палітыку дзяржавы ва ўмовах рэфармавання грамадства; у вызначэнні тэндэнцый і перспектыў іх далейшага фукцыянавання.

Дакладнае веданне механізму працы літаратурна-мастацкага часопіса, умоў яго фінансавання, тэматычнай структуры, мэтавага прызначэння і ўздзеяння на аўдыторыю можа аказаць рэальную дапамогу ў выпрацоўцы алгарытму дзеянняў па выданні літаратурна-мастацкага часопіса ў сучаснай сітуацыі, аптымізацыі дзейнасці існуючых літаратурна-мастацкіх часопісаў. Даследаванні ў гэтай галіне могуць стаць дадатковым рэсурсам прыцягнення ўвагі да праблем літаратурнага цэха, фарміравання карпаратыўнага мыслення, павышэння прэстыжу прафесіі літаратара.

Сацыякультурная сутнасць літаратурна-мастацкіх часопісаў выяўляецца ў тым, што яны з'яўляюцца адным з важных механізмаў ўзнаўлення і перадачы сацыяльнага вопыту, увасобленага ў формах, найбольш актуальных для чытацкай аўдыторыі. Літаратурна-мастацкія часопісы як сацыякультурны феномен існуюць у дыялектычным адзінстве спецыфічнай самакаштоўнасці мастацтва і сацыяльна-культурных патрэбаў грамадства. Менавіта таму змястоўныя змены ў літаратурна-мастацкіх часопісах з'яўляюцца своеасаблівым адлюстраваннем сацыяльна-эканамічных працэсаў, якія адбываюцца сёння. Пры гэтым «тоўсты» часопіс ва ўсе часы з'яўляўся інстытутам, які фармуе грамадскую свядомасць, каштоўнасны патэнцыял асобы, механізмам, што спрыяюць вырашэнню праблемы культурнай ідэнтыфікацыі чалавека, спосабам здабыцця ім духоўнай і эмацыйнай устойлівасці асобы, выпрацоўкі антрапалагічных каштоўнасцей, усведамлення датычнасці да адзінай культурнай супольнасці, да нацыянальнай культуры. Дзякуючы літаратурна-мастацкім часопісам як канстанце праставай канцэнтрацыі каштоўнасцей культуры, магчымасці захавання культуры, духоўнага ўдасканалення і культурнага развіцця відавочна павінна пашырацца.

АПОВЕСЦЬ «ПАЛЕСКАЕ ЛЕТА» МІКОЛЫ КАПЫЛОВІЧА: ДА ПЫТАННЯ СТЫЛЮ

Н. В. Кузьміч

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,
вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,
kuzmich_nv@bsu.by

У матэрыяле разглядаюцца некаторыя асаблівасці стылю беларускага пісьменніка Міколы Капыловіча. У якасці прыкладу ўзяты адзін з апошніх твораў аўтара – аповесць «Палескае лета».

Ключавыя словы: беларуская літаратура; аповесць «Палескае лета»; індывідуальны стыль; Мікола Капыловіч.

ПОВЕСТЬ «ПАЛЕСКАЕ ЛЕТА» НИКОЛАЯ КОПЫЛОВИЧА: К ВОПРОСУ СТИЛЯ

Н. В. Кузьмич

Белорусский государственный университет,
ул. Кальварийская, 9, 220004, г. Минск, Республика Беларусь,
kuzmich_nv@bsu.by

В материале рассматриваются некоторые особенности стиля белорусского писателя Николая Копыловича. В качестве примера взято одно из последних произведений автора – повесть «Палескае лета».

Ключевые слова: белорусская литература; повесть «Палескае лета»; индивидуальный стиль; Николай Копылович.

Пісьменнік Мікола Капыловіч ужо ў першым зборніку прозы «Скрозь жывуць людзі» выявіў свой адметны стыль, асаблівасцямі якога можна назваць лаканізм выяўленчых і лексічных прыёмаў і сродкаў, стрымана-лірычная танальнасць, моцны суб'ектыўны пачатак. У далейшым у зборніках «Дні ціхай восені» (1981), «Засада» (1979), «Чужы сваяк» (1987) гэтая стылёвая мадэль атрымала аналітычна-эстэтычнае паглыбленне і развіццё.

